Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+ТВ ПРАГРАМА

11 ЛІСТАПАДА 2022 г. ПЯТНІЦА № 222 (29844)

МАРЫЦЕ ЗНЯЦЦА Ў СЕРЫЯЛЕ? ЁСЦЬ ШАНЦ! 5

СРОДАК АД ВОСЕНЬСКАЙ ДЭПРЭСІІ... 13

КАРАТКА

- **Аб'яднаны рынак электраэнергіі Беларусі і Расіі пачне працаваць з 1 студзеня 2024 года.**
- Кітай перадаў Беларусі больш за 2 млн доз вакцыны ад каранавіруса.
- **З пачатку года энергаёмістасць ВУП Беларусі знізілася на 5,4 працэнта.**
- Мінюст зарэгістраваў Міжнародны дабрачынны фонд імя Эміля Чэчкі.
- **Мінбудархітэктуры: парадак будаўніцтва прыватных дамоў спрошчаны, але не ў выпадку дзяржпадтрымкі.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі:

«Беларусь і Расія паслядоўна развіваюць інтэграцыйнае супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы, пашыраюць фарматы ўзаемадзеяння, напаўняюць сумесныя праграмы і праекты новым зместам. Умацаванню саюзніцкіх сувязяў садзейнічаюць адкрытыя і даверлівыя адносіны паміж кіраўнікамі дзяржаў. Кансалідаваныя дзеянні органаў дзяржкіравання і парламентарыяў з'яўляюцца важным інструментам процідзеяння выклікам і пагрозам, якія ўзнікаюць у тым ліку ў сферы энергетычнай бяспекі. У нас ёсць мноства напрамкаў узаемадзеяння, якія можна ўдасканаліць для больш эфектыўнага вырашэння стратэгічных задач. Ключавая з іх — своечасова, якасна і ў поўным аб'ёме забяспечыць рэалізацыю зацверджаных інтэграцыйных праграм».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Каб нашы людзі адчулі, што дзяржава бачыць гэтыя праблемы і спрабуе іх вырашыць»

Навацыі ў сацыяльнай абароне грамадзян абмеркавалі ў Прэзідэнта

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра працы і сацыяльнай абароны Ірыну Касцевіч. Галоўная тэма — удасканаленне работы Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Таксама на даклад былі запрошаны віцэ-прэм'ер Ігар Петрышэнка, які курыруе дадзеную сферу, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Ермаловіч, міністр фінансаў Юрый Селівёрстаў, старшыні Мінгарвыканкама і Мінаблвыканкама Уладзімір Кухараў і Аляксандр Турчын. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што размова звязаная з удасканаленнем сістэмы кіравання сацыяльным сектарам, эканамічным сектарам і ўвогуле сістэмы кіравання ў дзяржаве.

Фота БелТА.

З 1 снежня павялічацца пенсіі

«Пытанне не самае маштабнае, не самае, можа быць, важнае ў плане ўдасканалення сістэмы кіравання, але з пункту гледжання забеспячэння сацыяльнай бяспекі, сацыяльнага абслугоўвання нашых людзей яно вельмі важнае. Тым больш што яно датычыцца нашых людзей — гэта людзі пенсіённага ўзросту; людзі, якія трапілі ў часовую нейкую бяду, якім мы павінны падставіць плячо. Нехта захварэў, недзе людзі з абмежаванымі магчымасцямі і здольнасцямі і гэтак далей», — адзначыў ён.

СТАР. 2

ЛІСТАПАДАЎСКАЯ КАСАВІЦА

Фота БелТА.

Цёплае заканчэнне восені аграрыі выкарыстоўваюць напоўніцу. Напрыклад, у агракамбінаце «Туча», што ў Клецкім раёне, працягваецца нарыхтоўка кармоў — ідзе чацвёрты ўкос траў. У траншэі ўжо закладзена 9 тысяч тон сенажу і 14 тысяч тон сіласу. Гэтых запасаў агракамбінату (ён, дарэчы, з'яўляецца філіялам ААТ «Мінск-Крышталь») хопіць мінімум на паўтара года. Дырэктар сельгаспрадпрыемства Уладзімір ЗАХАРЧУК (*на фота*) такім становішчам спраў задаволены.

Разумныя грошы

БЕЛАРУСКІ РУБЕЛЬ ВЯРНУЎ СВАЮ СТАБІЛЬНАСЦЬ

Цяпер можна таксама запасціся расійскімі рублямі і кітайскімі юанямі...

Раней у любой крызіснай сітуацыі долар і еўра істотна раслі, і ў цэлым курс так званай свабодна канверсійнай валюты лічыўся ледзь ці не самым наглядным індыкатарам сітуацыі ў эканоміцы. Цяпер мы жывём у новай рэальнасці, калі складана адназначна адказаць на пытанне — на якую валюту лепш рабіць стаўкі і як захаваць зберажэнні, пакуль рынак «штарміць»?

Многія людзі сёння заклапочаныя пытаннем, дзе, як і ў чым захоўваць свае зберажэнні, бо турбулентнасць на фінансавым рынку беспрэцэдэнтная і наўрад ці паддаецца прагнозам.

На жаль, не існуе дастаткова надзейных агульнадаступных варыянтаў засцярогі зберажэнняў насельніцтва, лічаць фінансавыя аналітыкі. Практычна ўсе звыклыя інструменты інвеставання, уключаючы дзяржаўныя аблігацыі, нерухомасць, каштоўныя металы, могуць праявіць сябе самым непрадказальным і нават непрыемным чынам, але...

СТАР. 4

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Каб нашы людзі адчулі, што дзяржава бачыць гэтыя праблемы і спрабуе іх вырашыць»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Важная дэталь — прапануюцца не толькі ўдасканаліць Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, але і спадарожныя структуры, якія знаходзяцца з ім у цесным кантакце.

Аляксандр Лукашэнка, як і заўсёды, калі гаворка ідзе пра ўдасканаленне, задаў пытанні: «Ці трэба гэта? Адкуль з'явілася гэтае пытанне, у чым яго сутнасць і праблема?»

«Гэта не значыць, што мы не павінны ўдасканальваць структуру кіравання дзяржавай, асобных напрамкаў і галін. Я ўжо пра гэта казаў, не ламаючы саму сістэму, мадэрнізуючы, удасканальваць структуру трэба. Час ідзе. Але гэта калі трэба», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што фонд працуе нядрэнна, сёлета нават з прафіцытам. І цяпер не варта «назапашвацца гэтыя грошы, складваць у скарбонку». Таму Прэзідэнт падпісаў указ аб павелічэнні пенсій з 1 снежня. «З 1 снежня мы на 5-6 працэнтаў павялічым пенсію для нашых людзей. Павінен сказаць, што калі лічыць макраэканамічна ў сярэднім (як тое робіцца ва ўсім свеце), пенсіянеры не павінны на нас крыўдзіцца ў сувязі з невялікім павышэннем пенсій», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сёлета пенсіі павышаліся ўжо двойчы. «Таму гэта ў сярэднім, падкрэсліваю. Гэта вышэй за інфляцыю на сёння. Але калі мы яшчэ крок зробім, то гэта будзе ўжо значная перавага перад інфляцыяй. Хоць ведаеце, пенсіянеры пачуюць мае развагі і скажуць: «Мусіць, не валодае пытаннем, у нас сёе-тое падаражэла і не на 10 працэнтаў, а на 20», — сказаў беларускі лідар. Ён патлумачыў свой тэзіс, зноў вярнуўшыся да пытання цэнаўтварэння: «Я разумею, што пенсіянер не купляе брэндавыя нейкія рэчы, ён жыве сціпла і ў асноўным купляе прадукты харчавання, простае адзенне. І, можа быць, на нейкія групы тавару цэны выраслі на 10 працэнтаў. Зразумела, што недзе можа быць крыху вышэй. Таму і было прынята рашэнне па рэгуляванні цэн і выпрацоўцы сістэмы цэнаўтварэння, каб нашы людзі адчулі, што дзяржава бачыць гэтыя праблемы і спрабуе іх вырашыць, наколькі гэта магчыма. Паглядзім у снежні ці студзені, наколькі эфектыўна ўрад і губернатары працуюць у напрамку стрымлівання цэн», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка станоўча паставіўся да таго, што выплаты, якія выпадаюць на святочныя даты, выплачваюцца загадзя, як нядаўна было 7 лістапада. Па яго словах, гэта дробязь, але людзям прыемна, калі на некалькі дзён раней выплачваюцца пенсіі. Трэба дзейнічаць так і надалей.

«Не трэба расцягваць»

Адна з мер па ўдасканаленні Фонду сацыяльнай абароны прапануе адной структурай прызначаць і выплачваць пенсіі. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што калі тое прыжывецца, працэс мадэрнізацыі не трэба расцягваць і ўдасканальваць на працягу некалькіх гадоў. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў зрабіць гэта за два крокі, але калі ёсць упэўненасць. «Не трэба расцягваць у доўгую працэсы, якія трэба вырашаць хутчэй, калі іх можна вырашыць хутчэй», — дадаў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ўдасканаленне сістэмы павінна праходзіць пад адным пытаннем — ці сапраўды патрэбна і чаго не хапае. «Працуе сістэма — людзі да яе прывыклі. Што дасць гэтае ўдасканаленне? Вы прапануеце з нагоды лічбавізацыі загружаць усё ў камп'ютар, загрузіць у камп'ютар увесь улік працоўнай дзейнасці... Магчыма, калі без таго не можам абысціся. Але не хацелася б, каб зноў жа заўтра ў апазіцыйных ці варожых тэлеграм-каналах выкладвалі ўсю тую базу і гэтак далей. Вось тут нам трэба вызначыцца, ці трэба нам гэта рабіць сёння, ці трэба заўтра гэта рабіць, колькі нам гэта будзе каштаваць. І ці трэба гэта ўвогуле. Быццам бы працавалі і працуем, сістэма функцыянуе. Калі ў гэтым мы атрымаем нейкую карысць для людзей і для дзяржавы з улікам усіх рызык у тым ліку, — добра, пойдзем. Калі не — трэба ісці там, дзе трэба ісці. Калі не, можа, і не трэба». Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што такія пытанні ў яго ўзніклі пры першым чытанні дадзенай прапановы.

«Да мяшка грошай далучыць орган кіравання»

Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч далажыла, што Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва сапраўды працуе з прафіцытам. Пасля абвешчанага павелічэння пенсій, са снежня мінулага года да снежня гэтага, у выніку пенсія павялічыцца ў сярэднім на 125 рублёў.

«Так сабе грошы. Пенсіянеры ў нас небагатыя, дзякуй ім, што цярплівыя людзі, разумеюць, што адбываецца», — заўважыў Прэзідэнт.

Ірына Касцевіч падкрэсліла, што прапануецца перабудаваць сістэму сацыяльнага страхавання такім чынам, каб увесь цыкл пенсіённага і сацыяльнага страхавання (бальнічныя і дзіцячыя дапамогі), грошы, прызначэнні і выплаты былі пад Фондам сацыяльнай абароны насельніцтва. Сёння існуе падзел. Што датычыцца пенсій, узносы ідуць у Фонд, а прызначэнні і выплаты ідуць праз упраўленні сацыяльнай абароны райвыканкамаў, аблвыканкамы ж каардынуюць работу.

«Карацей, уся кухня варыцца там, а грошы яны бяруць з мяшка фонду. Вы прапануеце сёння да гэтага мяшка далучыць орган кіравання?» — удакладніў Прэзідэнт.

Міністр пагадзілася: вобразна кажучы, гэта так. Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва сёння — даходная частка больш за 20 мільярдаў рублёў. У суадносінах з рэспубліканскім бюджэтам гэта — 77 працэнтаў. «Грошы кіруюцца і выдаткоўваюцца ў рамках адной структуры, але гэта ўсё ж такі розныя структуры», — заўважыла Ірына Касцевіч. Але Прэзідэнт адзначыў: нягледзячы на тое што яны розныя, гэтыя структуры знаходзяцца ў адным кулаку. Гэта дзяржаўныя структуры.

«Мы хочам зрабіць два крокі. Першы: забраць пенсіі — гэта забраць прызначэнні з боку ўпраўленняў сацабароны. А другі аб'ёмны крок — гэта амаль 5 мільярдаў рублёў — дапамогі і дзіцячыя дапамогі, і іх прызначае прадпрыемства. У нас працуе заліковы механізм. Мы бачым праблемы ў тым ліку і па выплаце дапамог: або пераплата, або недаплата, або несвоечасовая выплата заработнай платы, калі гэта праблемная арганізацыя. Церпіць канкрэтны чалавек, калі ён знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці», — адзначыла Ірына Касцевіч.

Аляксандр Лукашэнка запытаў, чаму такія выплаты будзе прызначаць фонд, а не орган улады, да якога можна перадаць дадзены фонд. «Чаму мы не можам тое зрабіць? Гэта значыць Касцевіч будзе кіраваць, прызначаць збіраць грошы і іншае. Гэта замкнецца ўсё роўна на вашым міністэрстве як адзіны орган», — адзначыў ён. Абмеркаванне прыведзеных пытанняў выклікала актыўную дыскусію.

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

«Мы далей будзем працягваць развіваць інфармацыйны складнік фонду»

Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч расказала журналістам некаторыя падрабязнасці даклада ў Прэзідэнта. Па яе словах, Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва — дастаткова лічбавізаваны орган, які мае сур'ёзныя інфармацыйныя рэсурсы. «І мы ўбачылі, што можна было б зрабіць чарговы прагрэсіўны крок па асобных сэрвісах у адносінах да чалавека. Для гэтага, вядома, трэба як перабудаваць арганізацыйную структуру, пашырыўшы яе функцыянал, так і пашырыць і саму інфармацыйную сістэму. Але за гэтым стаяць людзі. Сёння гэта арганізацыі двух падпарадкаванняў. Гэта фонд, які акумулюе ўзносы ад наймальнікаў, і, як у народзе кажуць, «сабесы» — упраўленні сацыяльнай абароны, якія непасрэдна ажыццяўляюць прызначэнне і выплаты пенсій. Сістэма выбудавана, сістэма ўжо існуе не адно дзесяцігоддзе. Зразумела, што змяніць структуру і аб'яднаць гэтыя два органы — дастаткова рызыкоўны крок. І з тым, каб не атрымаць напружаныя і рызыкоўныя сітуацыі, усё ж такі прынялі рашэнне захаваць дзеючыя структуры, як ёсць. Але пры гэтым мы далей будзем працягваць развіваць інфармацыйны складнік фонду», — расказала яна. Міністр падкрэсліла, што фонд будзе інфармаваць чалавека аб яго стажы, аб яго заработнай плаце, з якой выплачваюцца ўзносы, для таго каб чалавек загадзя атрымаў інфармацыю аб сваёй будучай пенсіі. Апошняе важна з улікам таго, што з 1 кастрычніка запушчана новая сістэма — добраахвотнае накапляльнае страхаванне пенсій. Цяпер чалавек сам можа вызначаць: ён хоча атрымліваць толькі дзяржаўную пенсію або мець у старасці дадатковы даход. А для гэтага трэба мець усю інфармацыю.

«І вось тая інфармацыя, якая вядзецца з 2003 года, сёння пашыраецца. І тое, што ёсць у інфармацыйных сістэмах, — гэта знак роўнасці працоўнай кніжцы. Гэта таксама важны крок, які зрабіў Фонд сацыяльнай абароны для таго, каб забяспечыць гарантыі чалавека», — дадала Ірына Касцевіч.

Таксама міністр адзначыла, што Прэзідэнт падтрымаў і падпісаў указ аб павелічэнні пенсій на 5 працэнтаў: «Гэта закране больш за 2 мільёны чалавек — пенсіянераў па ўзросце. У кожнага пенсіянера гэты рост будзе розны, паколькі ён залежыць ад памеру пенсій. Гэта важны крок, які мы зрабілі сёлета, вельмі пазітыўны і правільны».

ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПАДЫХОД І РАБОТА НА МЕСЦАХ

У Савеце Рэспублікі абмеркавалі пытанні сацыядаптацыі дзяцей з асаблівасцямі развіцця

У Савеце Рэспублікі на чале з яго старшынёй Наталляй КАЧАНАВАЙ прайшло пасяджэнне Кансультатыўнага савета па пытаннях сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Для разгляду былі вынесены тэмы інклюзіі ў соцыум дзяцей з асаблівасцямі, псіхалагічная і медыцынская падтрымкі сем'яў. Таксама намечаны шляхі далейшай работы Кансультатыўнага савета. Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што Кансультатыўны савет як орган садзейнічае бацькам, якія выхоўваюць дзяцей з асаблівасцямі:

— У прыватнасці, патрэбна дапамога грамадскіх аб'яднанняў, неабыякавых людзей, якія займаюцца пытаннямі, што дапамогуць нашым сем'ям з дзецьмі-інвалідамі пераадольваць праблемы лягчэй і прасцей. Трэба, каб бацькі ведалі, што ёсць такі орган, куды можна прыйсці, абмеркаваць пытанні і ў далейшым вырашаць іх больш эфектыўна.

Наталля Качанава нагадала, што зусім нядаўна была прынята новая рэдакцыя Кодэкса аб адукацыі, дзе дакладна вызначылі інклюзіўную адукацыю:

— У нашай краіне ёсць такая структура, як цьютары, — яны суправаджаюць дзетак, якія вучацца ў школе. Але калі пачынаеш размаўляць з людзьмі на месцах, разумееш: не заўсёды кадры падрыхтаваны адпаведным чынам. Не кожны педагог можа працаваць з дзецьмі, у якіх ёсць асаблівасці. Гэта павінны быць падрыхтаваныя педагогі. Міністэрства спорту і турызму, Міністэрства адукацыі, Міністэрства аховы здароўя і нашы грамадскія аб'яднанні — мы ўсе гатовы займацца гэтымі пытаннямі і ўжо займаемся. Але пры ўмове, калі падключымся ўсе разам, у канкрэтнай сітуацыі акажам канкрэтную дапамогу, тады пастаўленыя задачы вырашацца прасцей.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што работа з дзецьмі і сем'ямі павінна быць дакладнай і чулай. Дапамогу і падтрымку трэба аказваць своечасова, каб у далейшым дзіця пабудавала шчаслівую будучыню:

— Яшчэ раз паўтаруся: гэта вельмі тонкая работа. Мы павінны тую сістэму, якую пабудавала дзяржава, рэалізаваць эфектыўным чынам. А вынік убачым, калі дзеці, якія маюць праблему, змогуць нармальна жыць у соцыуме, развівацца па меры сваіх магчымасцяў.

Падчас пасяджэння было адзначана, што ў краіне дастаткова людзей, якія займаюцца дадзенай праблемай і ўжо маюць сур'ёзныя вынікі і напрацоўкі. Так, **дырэктар тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Барысаўскага раёна Вольга КАПЫТОК** расказала аб паспяховых спосабах работы цэнтра:

— Наш цэнтр з'яўляецца абласной рэсурснай пляцоўкай па сацыялізацыі людзей з інваліднасцю. Сёння я з гонарам магу сказаць, што з дзесяці інвалідаў, якія прайшлі адаптацыю да працы, пяцёра з'яўляюцца супрацоўнікамі нашага цэнтра. Сваімі дасягненнямі яны паказваюць, што іх інваліднасць не з'яўляецца перашкодай у пабудове прафесійнай кар'еры. Некалькі чалавек — былыя спартсмены, якія зараз вядуць гурткі па сацыялізацыі і здароўі. Спецыялісты, якія валодаюць камп'ютарам, вядуць гурток, дзе людзі з інваліднасцю могуць навучыцца абыходзіцца з тэхналогіямі. Гэта прыклад таго, як роўны дапамагае роўнаму ў сацыялізацыі.

Наталля Качанава падкрэсліла, што прынятыя Кансультатыўным саветам рашэнні павінны даводзіцца да мясцовых органаў улады:

— Хачу звярнуць увагу і на тое, што мы не займаемся выключна адным захворваннем. Наша работа накіравана на ўсіх дзетак, якія маюць праблемы. Трэба павышаць кваліфікацыю дзіцячых псіхолагаў і педыятраў, каб дыягназ быў пастаўлены як мага раней. Мы павінны чэрпаць новае і абавязкова вучыць спецыялістаў, каб знайсці індывідуальны падыход да кожнага дзіцяці, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі.

Арына КАРПОВІЧ.

Блізкая ўлада

Выканкамы на сувязі

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 12 лістапада, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

• кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Андрэй Вацлававіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Дзяніс Мікалаевіч КУРЛЕНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

ДАКУМЕНТЫ, ВАЖНЫЯ ДЛЯ ЧАЛАВЕКА І ДЗЯРЖАВЫ

Хто трапіць пад амністыю, якім прадпрыемствам будзе падстаўлена плячо і што за паўнамоцтвы чакаюць аб'яднанні наймальнікаў?

На чарговым пасяджэнні дзявятай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу быў разгледжаны шэраг законапраектаў. Новаўвядзенні, у прыватнасці, чакаюць дакумент «Аб змяненні законаў па пытаннях адукацыі», які прадугледжвае прававое рэгуляванне адносін у сферы адукацыі.

Змяненні ўносяцца ў 20 законаў і два кодэксы Рэспублікі Беларусь. У прыватнасці, адбудзецца перайменаванне паслявузаўскай адукацыі ў навукова-арыентаваную, з тэрміналогіі выключаюцца такія паняцці, як «кірунак спецыяльнасці» і «спецыялізацыя». Законапраектам замацаваны правы грамадзян, накіраваных у замежныя арганізацыі для атрымання вышэйшай адукацыі за кошт рэспубліканскага бюджэту па спецыяльнасцях, неабходных для Рэспублікі Беларусь, падрыхтоўка па якіх у нашай краіне не ажыццяўляецца. Скарэкціраваны абавязкі апекуноў/папячыцеляў па забеспячэнні атрымання дзіцем агульнай сярэдняй адукацыі ў сувязі з увядзеннем у Кодэкс аб адукацыі прынцыпу абавязковай агульнай сярэдняй адукацыі. Адносіцца гэтая гарантыя і да дзяцей-сірот, якія засталіся без апекі бацькоў. Пашыраны пералік устаноў адукацыі, на будынках якіх на пастаяннай аснове ажыццяўляецца размяшчэнне Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь і ў якіх падчас правядзення ўрачыстых мерапрыемстваў выконваецца Дзяржаўны гімн нашай краіны. Вядома, гэта не ўсе заканадаўчыя навацыі. Некаторыя з іх ужо ўступілі ў сілу.

З індывідуальным падыходам

У двух чытаннях дэпутаты адобрылі законапраект «Аб амністыі ў сувязі з Днём народнага адзінства». Заканадаўчы акт унесены ў Палату прадстаўнікоў Прэзідэнтам Беларусі. Згодна з законапраектам, мяркуецца вызваліць ад шматлікіх відаў пакарання 4545 асуджаных, у тым ліку з месцаў пазбаўлення волі — 1600 чалавек, дзесяць з якіх з'яўляюцца непаўналетнімі. З папраўчых устаноў адкрытага тыпу дамоў вернецца паўтысячы асуджаных, з крымінальна-выканаўчых інспекцый — 2445 грамадзян. Акрамя таго, прадугледжваецца, што на год будзе скарочаны тэрмін пакарання для амаль чатырох тысяч асуджаных. Амністыя не будзе распаўсюджвацца на тых, хто ажыццявіў злачынныя дзеянні тэрарыстычнай і экстрэмісцкай накіраванасці.

Па меркаванні **члена Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Марыны ЛЯНЧЭЎСКАЙ,** гэта справядліва. «Аднак і ў такіх асоб ёсць права на паблажку, — удакладніла парламентарый. — Кожны з іх асабіста мае права звярнуцца да кіраўніка дзяржавы з просьбай аб памілаванні. Такія пытанні павінны разглядацца індывідуальна. Ёсць людзі, якія падвергнуліся ўплыву натоўпу або, як кажа наш кіраўнік дзяржавы, заблукалі».

Дэпутат расказала, што вынясенню на разгляд гэтага закона папярэднічала вельмі сур'ёзная работа. У прыватнасці, шырока абмяркоўваўся законапраект у Авальнай зале Палаты прадстаўнікоў.

— Закон аб амністыі вельмі чакаюць тысячы асуджаных, іх родныя і блізкія, — заўважыла Марына Лянчэўская. — Пад амністыю трапляюць сацыяльна ўразлівыя катэгорыі асоб: непаўналетнія, цяжарныя жанчыны, мужчыны і жанчыны, якія выхоўваюць дзяцей да 18 гадоў, пенсіянеры, людзі, якія пакутуюць на цяжкія захворванні (анкалагічныя, некаторыя формы туберкулёзу). Гэта і грамадзяне, якія пацярпелі ад наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Абавязковая ўмова амністыі — пакрыццё шкоды і раскаянне. Павінна быць і станоўчая характарыстыка з месца пазбаўлення волі. Амністыя не будзе прыменена ў адносінах да асоб, якія здзейснілі цяжкія або асабліва цяжкія злачынствы, а таксама тыя, што адносяцца да катэгорыі менш цяжкіх. Такім асуджаным прапаноўваецца паменшыць тэрмін пакарання ў выглядзе абмежавання і пазбаўлення волі на год. Непаўналетнія і асобы, якія ў непаўналетнім узросце здзейснілі злачынства, звязанае з незаконным абаротам наркотыкаў, трапляюць пад амністыю. Дарослым, асуджаным за аналагічнае злачынства, памілаванне чакаць не варта.

— Пагаршэння крымінагеннай абстаноўкі ў сувязі з рэалізацыяй амністыі не чакаецца, — пераканаць **міністр унутраных спраў генерал-лейтэнант міліцыі Іван КУБРАКОЎ.** — Гэта не першая амністыя, якая праводзіцца ў краіне. Гэта не значыць, што людзі, якія будуць вызвалены, выйдуць і застануцца самі па сабе на волі. Усе спісы накіруюць у тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў, і ўся інфармацыя пра іх будзе ў крымінальна-выканаўчай інспекцыі. Ім пры неабходнасці акажуць дапамогу ў працаўладкаванні, непасрэдна за імі будзе ажыццяўляцца пэўны кантроль. Механізм кантролю адпрацаваны.

Пад абаронай закона

Разгледжаны ў другім чытанні праект закона «Аб урэгуляванні неплацежаздольнасці» замацоўвае палажэнні, якія забяспечваюць рэалізацыю даручэнняў кіраўніка дзяржавы аб павелічэнні магчымасцяў для абароны правоў прадпрыемстваў, якія апынуліся ў складанай фінансавай сітуацыі. З прыняццем дакумента здымецца лішняя нагрузка з судоў, каардынацыя працэсу ў працэдурах банкруцтва будзе ўскладзена на ўрад, а таксама мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы. З гэтай мэтай у законапраект уключаны шэраг мер аборончага і матывацыйнага характару, накіраваных на захаванне вытворчых комплексаў і забеспячэнне кіравання працэсамі ў ходзе ўрэгулявання неплацежаздольнасці.

— Гэта вельмі важны дакумент для нашай дзяржавы, — падкрэсліла **член Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Святлана ГОРВАЛЬ.** — Гэта стымуляванне да своечасовага аб'яўлення прадпрыемствамі аб сваёй неплацежаздольнасці і ўступленне пад абарону закона. Галоўны акцэнт зроблены менавіта на рэабілітацыю прадпрыемстваў, а не на ліквідацыю — іншымі словамі, на абарону і захаванне нашых прадпрыемстваў. Закон падстаўляе плячо прадпрыемствам, якія, разумеючы ўсю складанасць фінансавай сітуацыі, у якую трапілі, своечасова ініцыіруюць сваю санацыю. Такім чынам, законапраект абараняе яшчэ і супрацоўнікаў прадпрыемства, іх сем'і.

Па словах дэпутата, кіраўнік дзяржавы неаднаразова казаў аб важнасці прафсаюзных арганізацый на прадпрыемстве. Законапраектам прадугледжана, што прадстаўнік прафсаюзных арганізацый у абавязковым парадку будзе ўваходзіць у склад крэдытораў. Такім чынам, знізу будзе ажыццяўляцца кантроль за дзейнасцю кіраўніцтва і некаторых крэдыторaў. «Прыняцце законапраекта дазволіць адлюстраваць усю нашу актыўную антыкрызісную дзяржаўную палітыку», — акцэнтавала ўвагу парламентарый.

У другім чытанні таксама адобраны і праект закона «Аб аб'яднаннях наймальнікаў». Заканадаўчыя навацыі накіраваныя на рэгуляванне грамадскіх адносін па пытаннях стварэння і дзейнасці аб'яднанняў наймальнікаў як аднаго з ключавых удзельнікаў сістэмы сацыяльнага партнёрства Беларусі, заснаванай на ўзаемадзеянні трох бакоў: прадстаўнікоў дзяржавы, супрацоўнікаў і наймальнікаў. Вызначаецца парадак стварэння аб'яднанняў наймальнікаў, прававое становішча і прынцыпы іх дзейнасці, а таксама правы і абавязкі аб'яднанняў наймальнікаў і іх членаў.

Як расказала **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Жанна СТАЦІЎКА,** спецыяльны закон будзе садзейнічаць таму, што ўзрасце роля аб'яднанняў наймальнікаў у пытаннях эканамічнага і сацыяльнага характару. «У першую чаргу, сістэматызуецца работа, што дазволіць больш эфектыўна задзейнічаць аб'яднанні наймальнікаў у распрацоўцы і падпісанні галіновых пагадненняў, — удакладніла дэпутат. — Прыняцце гэтага законапраекта дазволіць завяршыць будаўніцтва сістэмы сацыяльнага партнёрства ў нашай краіне і больш актыўнага ўдзелу наймальнікаў у вырашэнні эканамічных і сацыяльных пытанняў».

Заканадаўчыя навацыі

Парадак фарміравання, патрабаванні да дэлегатаў, удзел партый...

Якія прапановы ад грамадзян паступілі ў законапраект «Аб Усебеларускім народным сходзе»

Падчас пасяджэння Пастаяннай камісіі па заканадаўстве дэпутаты і эксперты разгледзелі заўвагі і прапановы, якія паступілі ў ходзе грамадскага абмеркавання законапраекта «Аб Усебеларускім народным сходзе». Палата прадстаўнікоў і Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі атрымалі звыш 500 прапаноў і заўваг. Абмеркаванне працягваецца.

Як паведаміла **старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Святлана ЛЮБЕЦКАЯ,** больш як 80 % з усіх прапаноў і заўваг накіравана на карэкціроўку прапанаваных норм. «Каля 12 % — пытанні, звязаныя з парадкам фарміравання самога Усебеларускага народнага сходу, а менавіта ўдзелу грамадзянскай супольнасці і яе прадстаўнікоў у рабоце, — адзначыла парламентарый. — Ёсць пытанні, якія датычацца дзейнасці асобных органаў УНС і карэкціроўкі пытанняў фарміравання Прэзідыума, работы сакратарыята».

У абмеркаванні важнага законапраекта прынялі ўдзел розныя катэгорыі насельніцтва. «Гэта вельмі шырокае ўцягванне правазнаўцаў розных катэгорый, — удакладніла Святлана Любецкая. — Прымалі ўдзел як прадстаўнікі акадэмічнай школы, фактычна ўсіх нашых вядучых ВНУ краіны, якія маюць вучэбныя падраздзяленні, звязаныя з правам. Акрамя таго, вельмі шырока прадставілі сябе студэнцкія суполкі, тыя, хто яшчэ навучаецца прымяненню права, і гэта вельмі добры стымул для іх, для прафесійнай дзейнасці. Нават прадстаўлены стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай адоранай моладзі з дастаткова канструктыўнымі і разумнымі заўвагамі, якія падлягаюць абмеркаванню».

Што датычыцца ўдзелу ў абмеркаванні прадстаўнікоў ад грамадзянскай супольнасці, гэта, па словах парламентарыя, і людзі з дастаткова значным жыццёвым вопытам, з гістарычнымі экскурсамі тых ці іншых прававых рашэнняў кіравання, якія ўжо мелі месца ў нашай дзяржаве. Удзельнічала ў абмеркаванні і частка жаночай аўдыторыі, якая таксама пазначыла пытанні прадстаўніцтва ў складзе УНС.

Грамадзян у асноўным хвалююць парадак фарміравання УНС, патрабаванні да дэлегатаў, прысутнасць у новым дзяржаўным органе прадстаўнікоў партый. Асобны блок заўваг датычыцца характару рашэнняў, якія будуць прымацца Усебеларускім народным сходам. Цікавяцца грамадзяне, якія прынялі ўдзел у абмеркаванні, і тым, як будзе ажыццяўляцца кантроль выканання рашэнняў УНС, якой будзе працэдура адмены рашэнняў Усебеларускага народнага сходу, ці будуць з'яўляцца рашэнні УНС нарматыўнымі прававымі актамі. Частка прапаноў датычыцца прадстаўніцтва ва Усебеларускім народным сходзе грамадзянскай супольнасці.

— Катэгорыі прапаноў розныя, частка з іх не адпавядае ўжо прынятым на рэферэндуме палажэнням Канстытуцыі, — акцэнтавала ўвагу старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве. — Гэта значыць, яны выходзяць за межы тых кампетэнцый, якія падтрыманы народам у самих палажэннях Канстытуцыі. Частка прапаноў уваходзіць у прамую супярэчнасць з тымі палажэннямі, якія сёння запісаны ў Асноўным Законе і з якімі пагадзіліся на рэферэндуме.

У прыватнасці, адна з такіх прапаноў датычыцца магчымасці замежным грамадзянам прымаць удзел у рабоце Усебеларускага народнага сходу.

Што датычыцца вылучэння прадстаўнікоў працоўных калектываў ва Усебеларускі народны сход, па словах Святланы Любецкай, парадак фарміравання гэтага органа ўлады ўжо ёсць — дакладны і прамы. «Паколькі права вылучэння кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў дадзена і працоўным калектывам, спецыяльна гэтыя змены не былі ўнесены ў ходзе ўдасканалення Канстытуцыі, — заўважыла дэпутат. — Такі механізм захаваны. Таму для тых працоўных калектываў, якія хочуць удзельнічаць у гэтых працэсах, жадаюць вылучыць сваіх прадстаўнікоў, у тым ліку на Усебеларускі народны сход, гэта прамы шлях вылучаць дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў, якія ў выніку гарантавана ўвойдуць у склад Усебеларускага народнага сходу. Гэта будзе яшчэ адна дадатковая грамадская функцыя для такой катэгорыі асоб, прадстаўнікоў народа».

У цэлым да грамадзян, якія могуць прымаць удзел у рабоце УНС, усімі зацікаўленымі, хто ўдзельнічаў у абмеркаванні, прад'яўляюцца дастаткова высокія патрабаванні. «І гэта вельмі паказальна, — пераканана Святлана Любецкая. — Лейтматывам па ўсіх прапановах праходзіць думка аб тым, што гэта павінны быць высокапрафесійныя людзі. Ёсць прапанова ўстанавіць нават цэнзы па сферах дзейнасці: юрысты, эканамісты, палітолагі, міжнароднікі. Хтосьці гаворыць аб тым, што неабходна прама прапісаць цэнзы для прэзідыума УНС і патрабаванні і да старшыні, і да намесніка. Яны таксама злучаны ў большай ступені з узроўнем кампетэнцыі і ўзроўнем адказнасці, здольнасцю прымаць кіраўніцкія рашэнні».

Дастаткова цікавая заўвага датычыцца як права УНС устанаўліваць дзяржаўныя святы, так і ўносіць прапановы аб іх адмене. Ёсць прапанова пашырыць кампетэнцыі прэзідыума. «Калі ў цэлым ахарактарызаваць прапановы, трэба адзначыць дастаткова глыбокі і ўцягнуты падыход да вывучэння тых ці іншых нормаў і прапаноў, якія былі выкладзены ў зваротах, што паступілі, — акцэнтавала ўвагу парламентарый. — Узровень правасвядомасці на фоне вось такога грамадскага абмеркавання дастаткова яскрава праяўляецца. Ён расце, фарміруецца, і гэта можна ацэньваць толькі пазітыўна».

Усе прапановы і заўвагі, якія паступілі і працягваюць паступаць, будуць вывучацца на прадмет прымальнасці іх рэалізацыі ў гэтым законапраекце. Некаторыя могуць быць рэалізаваны ўжо цяпер. Частка з іх, магчыма, на далейшую перспектыву будзе ўлічвацца для развіцця заканадаўства.

Як адзначыў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Аляксандр АМЕЛЬЯНЮК,** падыход да ацэнкі праекта, які быў вынесены на абмеркаванне, не быў зведзены толькі да пытанняў фарміравання работы Усебеларускага народнага сходу. «Глыбіню вывучэння гэтага пытання дакладна відаць там, дзе людзі гавораць аб патрабаваннях да саміх дэлегатаў, — канстатаваў парламентарый. — Тыя, хто абмяркоўваў праект, хочуць, каб дэлегаты, па-першае, былі людзьмі кампетэнтнымі, прафесіяналамі кожны ў сваёй сферы, каб валодалі пэўным палітычным вопытам. Прапаноў, якія адносяцца да кандыдатаў у дэлегаты, дастаткова шмат: гэта і ўзроставы цэнз, і крытэрыі аднясення да тых ці іншых прафесій. Размова аб тым, каб чалавек меў у тым ліку вопыт кіруючай работы, каб веды ў сферы кіравання перанесці ў сферу дзейнасці Усебеларускага народнага сходу».

Вераніка КАНЮТА.

БЕЛАРУСКІ РУБЕЛЬ ВЯРНУЎ СВАЮ СТАБІЛЬНАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Раней параўноўваць захоўванне наяўных долараў і беларускіх рублёў не мела сэнсу. Усім было вядома, што курс рубля да долара за год зніжаўся мінімум на 8—15 %, таму казаць аб доўгатэрміновым захоўванні рубля і зусім не даводзілася. Так было да жніўня 2020 года, калі наша валюта значна патаннела (да 2,64 рубля за долар) літаральна за месяц. Але самае цікавае, як успрымаўся наш рубель на працягу апошніх двух гадоў. Сёлета ў лютым і сакавіку беларуская валюта апускалася нават значна ніжэй (да 3,15 рубля за долар). Але, як аказалася, гэта быў не эканамічна вывераны курс, а курс «на эмоцыях». Досыць хутка беларускі рубель вярнуў страчаную стабільнасць, а ў апошні час працягвае ўпэўнена ўмацоўвацца да долара і еўра.

ДОЛАР І ЕЎРА НІКОМУ НЕ ПАТРЭБНЫЯ?

На валютным рынку цяпер складваецца анамальная сітуацыя, абумоўленая больш геапалітычнымі, чым эканамічнымі прычынамі. Змяняецца структура плацежнага і гандлёвага балансу. Скарачэнне імпарту і антысанкцыйныя меры на валютным рынку нашай вялікай суседкі выклікалі абвал попыту на долар і ў нас. Схема «разлікаў за газ у рублях», на якой настойваюць улады Расіі, па сутнасці, азначае, што заходнія кампаніі вымушаныя пералічваць еўра на спецрахунку, дзе яны будуць канвертавацца ў расійскія рублі. Фактычна гэта мае на ўвазе 100 % абавязковы продаж валюты.

Прывабна выглядае ўкладанне зберажэнняў у такія «ахоўныя» валюты, як швейцарскія франкі, японскія ены, нарвежскія кроны, аўстралійскія і канадскія долары. Але ў нашы неспакойныя часы і яны не абароненыя ад ваганняў.

Пры высокіх цэнах на сыравіну расійскі валютны рынак атрымлівае велізарны прыток долараў і еўра, што забяспечвае ўмацаванне расійскага рубля. І беларускі рубель пасля кароткачасовага спаду ўмацаваўся да долара і еўра, але ўпаў адносна расійскага рубля.

Эксперты фінансавага рынку лічаць, што калі беларуская эканоміка здолее канчаткова пераарыентавацца на Усход, то патрэбнасць у долярах і еўра для разлікаў з замежнымі пастаўшчыкамі скароціцца.

Яшчэ адна асаблівасць згаданай новай рэальнасці — зніжэнне курса долара і еўра не перашкаджала цэнам расці (нават на прадукты харчавання). Гэты загадкавы парадокс заўважыў кіраўнік нашай дзяржавы, пасля чаго Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю вырашыла навесці парадак у сферы цэнаўтварэння. Цяпер на цэны будзе больш уплываць курс расійскага рубля і цэлы шэраг іншых фактараў.

Да аўтара гэтых радкоў у апошні час звяртаюцца нашы падпісчыкі з пытаннем, якую валюту купляць — долар ці еўра? Мой адказ, што выбіраць трэба беларускі рубель, іх не задавальняе. У такім выпадку паспрабуем прааналізаваць два варыянты.

Блізкая да нашай краіны валюта — еўра. Што з ёй? У 2022 годзе еўра пабіў гістарычны мінімум у адносінах да долара. Еўра — паўнавартасная валюта, курс якой залежыць ад таго, наколькі людзі вераць у эканоміку краіны (у дадзеным выпадку рэгіёна). Гэта непасрэдна звязана з эканамічнымі паказчыкамі.

Эксперты фінансавага рынку лічаць, што калі беларуская эканоміка здолее канчаткова пераарыентавацца на Усход, то патрэбнасць у долярах і еўра для разлікаў з замежнымі пастаўшчыкамі скароціцца.

З-за энергетычнага крызісу ў Еўропе высокая інфляцыя, узрасла пагроза для розных галін эканомікі. Апошняе негатыўна адбіваецца на веры людзей у будучыню еўра. На жаль, заканчэнне негатыўных з'яў пакуль складана прагназаваць. Напрыклад, ужо цяпер відаць, што ёсць праблемы з сельскагаспадарчай прадукцыяй — і таму еўра становіцца менш каштоўным.

На мой погляд, і сама па сабе структура ЕС вельмі праблемная, ёсць унутраныя і эканамічныя, і палітычныя супярэчнасці. Пры ўмове, што краіны Еўразаюза будуць больш супрацоўнічаць паміж сабой і змогуць пераадолець крызісныя наступствы, еўра можа быць стабільнай валютай. Але... занадта там шмат падводных камянёў.

З доларам наогул усё досыць складана. У Расіі ў апошні час прапануюць цалкам адмовіцца ад выкарыстання дадзенай валюты. Ды і ў нас яе апошнім часам неяк недалюбліваюць. Эксперты тлумачаць, што замежная валюта для распаўсюджвання яе ў абароце павінна валодаць стабільным курсам, ліквіднасцю, а таксама не павінна быць загараджальнага валютнага кантролю ў краіне — эмітэнце валюты.

Каштоўныя паперы сёння сталі рызыкоўнымі абсалютна ўсе. Рызыку можна знізіць пры добра дыверсіфікаваным партфелі акцый надзейных сусветных кампаній, скажам, высокатэхналагічных, энергетычных, харчовых, транспартных. У доўгатэрміновай перспектыве такі партфель прынясе добрую выгаду.

Тут узнікае галоўнае пытанне — для чаго гэтую валюту набываюць звычайныя людзі? Для інвестыцый? За апошнія гады долар не падрос, а працэнты па валютных дэпазітах у разы меншыя, чым даходнасць рублёвых укладаў.

Сярод валют на замену долару і еўра можна назваць кітайскі юань і дырхам (валюта ААЭ), а таксама шэраг іншых валют «больш дробных рынкаў». Сёння нашу ўвагу ўсё больш прыцягвае юань. І хоць нядаўна назіралася яго даволі доўгае падзенне, ёсць нават гульцы рынку, якія прапануюць дэпазіты ў кітайскай валюце. І гэта, верагодна, стане модным.

Пры ўсёй моцы кітайскай эканомікі, юань рэгулюецца нярынкавымі метадамі. Я вельмі паважаю такі падыход: кітайцы мяняюць курс у залежнасці ад таго, трэба стымуляваць імпарт або экспарт. А захоўваць грошы ў валюце, якая падстрахоўваецца адміністрацыйнымі рашэннямі і мае цэлы шэраг абмежаванняў па перамяшчэнні капіталу, заўсёды рызыкоўна.

ЗОЛАТА І КАШТОЎНЫЯ ПАПЕРЫ — НЕ ДЛЯ ПРОСТЫХ ЛЮДЗЕЙ

Напрыклад, каштоўныя камяні і металы. Яны надзейныя і прыбытковыя толькі ў доўгатэрміновай перспектыве — 15—20 гадоў. Золата і брыльянты — добры спосаб захоўвання і прымнажэння багацця — для тых, у каго хапае цярпення і рэсурсаў. Напрыклад, залатыя зліткі, набытыя ў нулявыя гады, далі за 20 гадоў вельмі нядрэнную прыбытковасць нават з улікам інфляцыі і змен валютных курсаў. Але тым, хто жыве «ад авансу да палучкі», такія інвестыцыі не падыдуць.

Зрэшты, на гэтым рынку таксама часта бываюць перыяды высокай валатыльнасці, таму няма гарантый, што цэны не ўпадуць менавіта тады, калі вам неабходна будзе абярнуць свае скарбы ў наяўнасць.

Каштоўныя паперы сёння сталі рызыкоўнымі абсалютна ўсе. Рызыку можна знізіць пры добра дыверсіфікаваным партфелі акцый надзейных сусветных кампаній, скажам, высокатэхналагічных, энергетычных, харчовых, транспартных. У доўгатэрміновай перспектыве такі партфель прынясе добрую выгаду. Але для таго і раней былі патрэбныя час і значныя сродкі, а таксама пэўныя веды. Цяпер укласціся ў такія інструменты стала складана, а вярнуць грошы назад — яшчэ складаней. Да таго ж многія замежныя фінансавыя кампаніі проста адмаўляюцца працаваць з беларускімі інвестарамі.

Эксперты тлумачаць, што замежная валюта для распаўсюджвання яе ў абароце павінна валодаць стабільным курсам, ліквіднасцю, а таксама не павінна быць загараджальнага валютнага кантролю ў краіне — эмітэнце валюты.

Тыя, хто гатовы рызыкнуць, могуць звярнуцца да такіх укладанняў, як аблігацыі беларускіх кампаній або токены. Пакуль у нас вельмі рэдка назіраліся дэфолты па аблігацыях — летась іх было ўсяго дзесяць, гэта значыць 0,01 % усіх выпускаў. Але магчыма, што ў далейшым будзе значна больш. Трэба адзначыць, даходнасць аблігацый з улікам інфляцыі і валютных ваганняў таксама пад пытаннем.

Прывабна выглядае ўкладанне зберажэнняў у такія «ахоўныя» валюты, як швейцарскія франкі, японскія ены, нарвежскія кроны, аўстралійскія і канадскія долары. Аднак ў нашы неспакойныя часы і яны не абароненыя ад ваганняў. Наогул сёння наўрад ці існуюць інструменты, здольныя засцерагчы ад страт, і тым больш — павялічыць невялікія зберажэнні. Асабліва не варта рабіць рызыкоўныя ўкладанні на фінансавых рынках, у якіх вы не арыентуецеся.

Я зрабіў усё проста — паклаў грошы у беларускі банк, вядома, у нацыянальнай валюце.

Сяргей КУРКАЧ.

Ну і ну!

Разбіў лабавое шкло ў тралейбусе

Каб вярнуць каханую

Любоўны парыў і гучная сварка скончыліся для 31-гадовага жыхара Віцебска завяршэннем крымінальнай справы за хуліганства. Падрабязнасці паведамляе УУС аблвыканкама.

Усё здарылася з-за спробы памірыцца з каханай. Іх непаразуменне адбылося на прыпынку грамадскага транспарту ў Віцебску. Каля 10 гадзін вечара дзяўчына пакрыўдзілася на мужчыну і паспрабавала з'ехаць ад яго на тралейбусе.

Малады чалавек пачаў спрабаваць спыніць электрычны грамадскі транспарт з пасажырамі ўнутры. Калі той усё ж паехаў па маршруце, дагнаў яго і разбіў бакавое люстэрка і лабавое шкло. Пагром прынёс шкоду на суму амаль 1100 рублёў.

Пасля інцыдэнту тралейбус спыніўся, а мужчына і яго сяброўка разам зніклі з месца здарэння. Асобу хулігана ўстанавілі супрацоўнікі крымінальнага вышуку Першамайскага РАУС.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Швейцарыі прапанавалі правесці рэферэндум аб недалучэнні да санкцый і ваенных блокаў

Швейцарская народная партыя аб'явіла збор подпісаў у падтрымку правядзення рэферэндуму аб недалучэнні да санкцый і міжнародных ваенных саюзаў. Пра гэта паведаміла РІА «Навіны». Прадстаўнікі партыі і яе прыхільнікі прапануюць дапоўніць Канстытуцыю краіны новым артыкулам «Аб швейцарскім нейтралітэце». Мяркуецца, што яна будзе ўключаць у сябе забарону на далучэнне краіны да санкцый супраць «ваюючых дзяржаў» і ваенных блокаў. Пры гэтым удакладняецца, што супрацоўніцтва з ваеннымі ці абароннымі саюзамі дапускаецца толькі ў выпадку прамога ваеннага ўварвання на тэрыторыю Швейцарыі. Увядзенне санкцый таксама магчымае толькі ў тым выпадку, калі рашэнне аб іх прынятае на ўзроўні ААН.

Еўрапейскія рахункі за газ і электрычнасць выраслі амаль удвая

Такія даныя згадваюцца ў сумеснай справаздачы Energie-Control Austria, Венгерскага ўпраўлення па рэгуляванні энергетыкі і камунальных паслуг (MEKH) і энергетычнай кансалтынгавай кампаніі (VaasaETT), паведаміў Euronews. У даследаванні аб індэксе цэн на энергію для хатніх гаспадарак разглядаліся цэны на газ і электрычнасць у 33 еўрапейскіх краінах. Адзначаецца, што рэзкі скачок цэн на энерганосьбіты ў параўнанні з мінулым годам выкліканы спалучэннем такіх фактараў, як рост попыту, звязаны з аднаўленнем эканомікі пасля пандэміі, анамальныя ўмовы надвор'я, рэкордна высокія цэны на прыродны газ з-за адмовы ад расійскіх энергарэсурсаў і ўкраінскі крызіс. Адзначаецца, што цэны на газ у Рыме, Люксембургу, Лісабоне, Дубліне, Парыжы, Вене, Бруселі, Берне, Капенгагене і Стакгольме дасягнулі новых рэкордных вышынь. У тройку сталіц з найбольшым ростам цэн на электраэнергію ўвайшлі Дублін, Рым і Вена.

Першая агульнанацыянальная забастоўка медсясцёр пройдзе ў Вялікабрытаніі

У Злучаным Каралеўстве ў канцы года пройдзе першая агульнанацыянальная забастоўка медсясцёр і медбратоў. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на BBC. За арганізацыю пратэстаў выступілі прафсаюзы медыцынскіх работнікаў Англіі, Паўночнай Ірландыі, Уэльса і Шатландыі, уключаючы Каралеўскі каледж медсястрынскай справы, які аб'ядноўвае амаль паўмільёна работнікаў медыцынскай галіны. Пратэстоўцы будуць патрабаваць павышэння заработнай платы на фоне рэкорднага росту інфляцыі. Цяпер яе ўзровень складае 10 працэнтаў і можа ўзрасці да 12 працэнтаў да канца года. За апошнія 12 гадоў заробкі медсясцёр зменшыліся на 20 працэнтаў. Гэта прывяло да скарачэння штату работнікаў, вострага недахопу персаналу ў бальніцах і падзення якасці медыцынскага абслугоўвання. Плануецца, што ўдзел у забастоўцы возьме каля паловы ўсіх бальніц і медыцынскіх цэнтраў краіны.

НАТХНІЦЦА КЛАСІКАЙ

Заўтра, 12 лістапада, на «Беларусь 3» — чарговая прэм'ера: канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча «Мой родны кут» да 140-годдзя Коласа і Купалы, які быў зняты ў Белдзяржфілармоніі.

У праграме, прысвечанай знакамітым класікам беларускай літаратуры, сабраны творы Аляксея Туранкова, Ігара Лучанка, Уладзіміра Мулявіна, Алега Молчана, Валерыя Іванова, Алены Атрашкевіч і іншых вядомых айчынных кампазітараў, што знайшлі натхненне ў тэкстах Якуба Коласа і Янкі Купалы. Інструментальная музыка, папулярныя песні, харавыя рамансы, апрацоўкі беларускіх народных мелодый — кожнае сачыненне, адабранае для праграмы, яскрава дэманструе вобразы высокай паэзіі песняроў і прыгажосць беларускага фальклору.

Прагучаць яны ў выкананні Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча і Дзяржаўнага камернага хору Рэспублікі Беларусь. Дырыжоры — заслужаныя артысты Беларусі Наталля Міхайлава і Аляксандр Крамко. Сярод салістаў аркестра і хору пачуем Андрэя Коласава, Ігара Задарожнага, Анастасію Рачыцкую, Вераніку Чарняўскую, Арыну Аляксееву і Кацярыну Крашчук, які выканаюць вядомыя песні на вершы Коласа і Купалы.

Не прапусціце тэлеверсію канцэрта ў суботу на сацыякультурным у вячэрнім эфіры.

Белтэлерадыёкампанія ладзіць кастынг

Цяпер ідзе набор тэлевядучых і акцёраў масавых сцэн для праектаў уласнай вытворчасці. Удзельнічаць у адборы можа кожны, таму што ўзрост, пол, вопыт працы не маюць значэння.

Таму ўсім тым, хто марыў аб прафесіі тэлевядучага, зняцца ў серыяле альбо трапіць у якасці гледача на любімае тэлешоу, самы час скарыстацца гэтай магчымасцю. А каб трапіць у кастынг-базу, патрэбна ўсяго толькі запоўніць анкету-заяўку на партале Белтэлерадыёкампаніі www.tvr.by. У ёй пазначце свае прозвішча, імя і імя па бацьку, узрост і кантактны нумар тэлефона, а ў дадатак яшчэ крыху раскажыце пра сябе і дашліце некалькі сваіх фотаздымкаў. І вось калі ваш вобраз супадзе менавіта з тым, які шукаюць рэжысёры, аўтары праграм, то яны абавязкова звяжуцца з вамі для абмеркавання дэталяў.

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 178

У Гомелі завяршыўся адкрыты рэспубліканскі камандны турнір па шашках-64 сярод юнакоў і дзяўчат 2009 г.н. і маладзейшых «Залатая восень — 2022», які праходзіў пры падтрымцы Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь. У турніры ўзялі ўдзел 10 камандаў. У кожнай камандзе гулялі тры хлопчыкі і адна дзяўчынка. Перамагла каманда Калужскай вобласці (Расія), на другім месцы Гомельская вобласць, трэцімі фінішавалі шашысты Гродзенскай вобласці.

№ 154



№ 154 Д. Камчыцкі (Магілёў)

Белыя простыя: a1, c1, d2, b6, c7, e7 (6)

Чорныя простыя: b2, a3, c3, b4, f4, a5, h6, g7 (8)

№ 155 В. Марцінкевіч (Глубокае)

Белыя простыя: g1, c3, e3, d4, c5 (5)

Чорныя простыя: f2, a3, a5, f8, h8 (5)

У шашкі-100 праблемы склаў міжнародны гросмайстар па шашачнай кампазіцыі Валдас Беляўскас (Літва).

№ 156

Белыя простыя: 41, 43, 44, 40, 34, 29, 25, 19, 14 (9)

Чорныя простыя: 45, 37, 32, 35, 21, 22, 7, 8 (8)

№ 157

Белыя простыя: 49, 44, 40, 34, 29, 19, 8, 10 (8)

Чорныя простыя: 41, 45, 38, 35, 27, 18, 11 (7)

Наступныя пазіцыі па правілах бразільскіх шашак складзеныя вядучым аддзела.

№ 158

Белыя простыя: c1, f2, a5, e5, f6, g7 (6)

Чорныя простыя: h2, c3, b4, b6, c7, b8, h8 (7)

№ 159

Белыя простыя: b2, f2, e3, f4, h6 (5)

Чорныя простыя: c3, d4, c5, g5, c7, h8 (6)

№ 160

Белыя простыя: g1, b2, c3, b4 (4)

Чорныя простыя: h4, a5, c7, e7 (4) нічыя.

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць, у № 160 пачынаюць і робяць нічыю. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Анонс: з 21 да 27 лістапада ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі (г. Мінск, вул. К. Маркса, 10) пройдзе першая ліга чэмпіянату Беларусі па шашках-64 (мужчыны, жанчыны). 21 лістапада: рэгістрацыя — 15.00-16.25, адкрыццё — 16.30, першы тур — 17.00.

Папярэднія заяўкі на ўдзел неабходна выслаць на belarusdraughts@gmail.com не пазней за 17 лістапада.

12—13 лістапада ў сталічнай СДЮШАР па шахматах і шашках (вул. Ракаўская, 24) пройдзе 12-ы адкрыты рэспубліканскі турнір па шашках-64 памяці вядомага беларускага майстра Г. І. Хацкевіча. Галоўны суддзя Валюк А. С., тэл. 80295621190.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 177 ад 28.10.22.

№ 148 1. e5-d6 c5:e3 2. f2:d4 c3:e5 3. a1:c7 b8:d6 4. a7-b8 e5-f4 5. b8:g3 h2:f4 6. g1-f2 +

№ 149 1. d6-c7 b8:d6 2. c5:g5 a3:e3 3. a5-b6 a7:c5 4. g5-h6 e3:g5 5. h6:h6 +

№ 150 Лег., cd6(ec5)зых., 1. f4-e5 a5:c7 2. h2-g3 h4:f2 3. g1:e3 d4:f2 4. a7-b8 f6:d4 5. b8:e7 f8:d6 6. h6:g1 +

№ 151 1. d6-e7 f8:b4 2. h6:c1 e3:c5 3. c1:b6 a5:c7 4. g1:e3 +

№ 152 1. e7-f8 c5:g5 2. f8:h6 h4:f2 3. h6-f8 b8:d6 4. f8:g1 + ПР 1. fg7 2 .ef8/ed8 (заўважыў А. Панчанка (Дніпро)).

№ 153 1. e3-d4 h2:f4 2. f2-g3 f4:h2 3. a5-b6 a7:e3 4. d2:b8 b4:d2 5. b8:g3 h2:f4 6. c1:e7 +

Першымі дакладныя адказы даслалі: Л. Трафімчык (Іўе), А. і А. Высоцкія (г. Капыль), С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзель), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), У. Ваўчкоў (Маладзечна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Сядзі і глядзі

ЧАС ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

9.20 Хакей. КХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Дынама-Мінск».
11.20 Піт-стоп.
11.50 Хакей. КХЛ. «Амур» (Хабараўск) — «Трактар» (Чэлябінск).
14.20 Хакей для ўсіх.
14.50 Хакей. Кубак Будучыні. Расія (U-18) — Казахстан (U-20).
17.10 Планета спорту.
17.30 Між іншым.
17.50 Спорт-цэнтр.
18.00 Аляксандр Пракапенка. Хранікальна-дакументальны фільм.
18.50 Футбол. Таварыскі матч (U-21). Беларусь — Іран.
20.50 Слэм-данк.
21.20 Хакей. Кубак Будучыні. Беларусь (U-20) — Расія (U-20).
23.25 Футбол. Чэмпіянат Іспаніі. Агляд.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
10.00 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 Серыял «Залатая клетка» (16+).
13.15, 22.40 Серыял «Міндальны прысмак кахання» (16+).
16.20 «Аляксандр Пракапенка. Народны футбаліст» (12+).
17.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
19.00 «Аб'ектыўНа» (16+).
20.00 Час.
21.10 «Удача ў прыдачу». Дзённік (12+).
21.15 «Усё зразумела» (16+) [СЦ].
21.25 Серыял «Ахвяра кахання» (16+).
0.50 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 11.30, 13.45 Дак. праект (16+).
10.40 «Акадэмія». Серыял (12+).
11.45 «Афіцэры-2. Адзін лёс на дваіх». Серыял (12+).
15.55, 16.50, 23.10 «Мечаны». Серыял (16+).
20.15, 23.05 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».
20.40 «Паляўнічыя на брыльянты». Серыял (12+).

МІР

5.00, 4.45 Мультфільмы (6+).
5.25, 10.10 Серыял «Даішнікі-2» [СЦ] (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 18.30 Навіны (бягучы радок).
13.15, 17.55 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.05, 16.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.10 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.05 «Міравое пагадненне» (16+).
18.50, 19.30, 20.05 «Гульня ў кіно» (12+).
20.50 «Слабае звяно» (12+).
21.40 «Назад у будучыню» (16+).
22.35 Серыял «Меч-2» (16+).
1.05 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
1.30 Маст. фільм «Настаўнік» (0+).
3.10 Серыял «Развод» [СЦ] (16+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.45 «Кропкі над і» (16+).
14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
14.40 «60 хвілін» (12+).
17.40 «Лёс чалавека з Барысам Карчэўнікавым» (16+).
18.55 «Малахаў» (16+).
20.30 «P. S.»
21.30 Серыял «Баранцава мора» (16+).
22.30, 23.15 Серыял «Марозава» (16+).
23.35 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.15, 8.20, 13.30, 16.40, 20.00, 22.35, 23.40 Сёння. Галоўнае.
6.10 «Здорава здаровым быць!» (6+)
7.00 Сфера інтарэсаў.
7.30 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 21.20 «НЗ.by».
8.55 «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
9.10 Серыял «Смерць у аб'ектыве» (16+).
10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Лёсы» (16+).
12.20, 14.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).
13.35, 16.50 Надзвычайнае здарэнне.
17.10 «За гранню» (16+).
18.05 «ДНК» (16+).
20.15, 21.35 Дэтэктыў «Спецбат» (16+).
22.40, 23.55 Серыял «Хуткая дапамога» (16+).

8 канал

7.00, 16.40, 18.20, 21.10, 1.00 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Захавальнік леў» (0+).
7.30 Дзіцячы серыял «Хачу ў кіно» (6+).
7.35 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).
8.20 Дак. серыял «Вяршыні свету».
9.05 Серыял «Ратавальнікі Малібу» (12+).
9.45 Драма «Дзённае святло» (16+).
11.40 Камедыя «Сямейка Адамс» (12+).
13.20 Баявік «Сардэчна запрашаем у пастку» (16+).
15.00 Серыял «Выдатнае стагоддзе» (16+).
16.45 Мультпарад. «Шахеразада» (6+).
17.20 Драма «Месяцавыя закаханыя» (12+).
18.25 Серыял «Каварныя пакаёўкі» (16+).
19.05 Дэтэктыў «Кандыс Рэнуар» (18+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.00 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
21.15 Трылер «Аперацыя «Арго» (16+).
23.15 Трылер «Час» (16+).

ВТБ

6.00 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45 «Лаві момант» (16+).
11.45 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
13.00 «Проста кухня» (16+).
13.50 «Уральскія пельмені» (16+).
14.45 Серыял «Два бацькі і два сыны» (16+).
15.40 «Каледж» (16+).
16.55 «Гатуем як шэф» (16+).
17.40 «100 месцаў, дзе паесці» (12+).
18.30 Серыял «Пастукайся ў мае дзверы» (16+).
21.50 Серыял «Карані» (16+).
23.35 Фільм-катастрофа «Агонь» (12+).
1.45 Драма «Разумніца Уіл Хантынг» (12+).
3.50 «Адна за ўсіх» (16+).
4.15 «6 кадраў» (16+).
5.10 Серыял «Ранеткі» (12+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.45 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35 «Вялікая французская рэвалюцыя». Дак. фільм [СЦ].
8.35, 16.15 Колер часу.
8.45, 16.30 «Асабістае шчасце». Маст. фільм.
10.15 «Назіральнік».
11.10 Шэдэўры старога кіно.
13.00 Адкрытая кніга [СЦ].
13.30 Улада факта.
14.15 Астравы [СЦ].
15.05 Лісты з правінцыі [СЦ].
15.35 «Энігма. Дзмітрый Сінькоўскі».
17.40, 2.10 Вакалісты.
18.45 «Квіток у Вялікі».
19.45 «Жорсткі раманс». Маст. фільм [СЦ].
22.05 «Неабсяжны Разанаў». Гала-канцэрт.
0.05 «Месяц май». Маст. фільм [СЦ].
1.25 Шукальнікі.

Настальгія

6.00 «Спяем, сябры!» (12+)
6.55 Маст. фільм «Калі б ведаць...» (18+)
8.15, 9.40, 11.30, 13.00, 14.35, 15.40, 17.30, 19.00, 20.45, 21.40, 23.30, 0.55, 2.40, 3.40, 5.30 Музычная настальгія (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.00, 17.00, 23.00, 5.00 «Блеф-клуб» (18+).
12.00 «Яловая субмарына» (16+).
13.20 Маст. фільм «Савой» (18+).
18.00 «Да і пасля...» (16+)
19.10 Маст. фільм «Лэдзі ў цягніку» (16+).
0.00 «Быў час» (16+).
1.10 Маст. фільм «Ноч у Касабланцы» (16+).

EuroSport 1

3.30, 7.00, 10.30, 15.00, 15.45, 21.00, 21.45 Снукер: UK Championship (6+).
5.00 Паўэрліфтынг: чэмпіянат свету (6+).
8.30, 20.30, 1.30 Веласпорт-трэк: Ліга чэмпіёнаў, Мальёрка (6+).
9.30, 10.00, 14.30 Кузаўныя аўтагонкі: кубак свету, Бахрэйн (6+).
12.30 Горныя лыжы: кубак свету, Цюрс. Жанчыны (6+).
13.30, 2.30 Горныя лыжы: кубак свету, Цюрс. Мужчыны (6+).
19.30 ВМХ (6+).

Кінакамедыя

1.00 Шосты гулец (12+).
3.40 Касталом (16+).
5.25 Легенда Заро (6+).
7.55 Бязлітасныя людзі (16+).
9.45 Дзікая парачка (16+).
11.35 Спадарыня пакаёўка (12+).
13.30 Ну, добры дзень, Аксана Сакалова! (16+)
15.25 Джуманджы (6+).
17.15 Як адчапіцца ад хлопца за 10 дзён (12+).
19.30 Злаві мяне, калі зможаш (12+).
22.05 Двайныя непрыемнасці (16+).
23.40 З 13 у 30 (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.25 «Анатомія забойства» (16+).
11.00 «Паглядзім» (12+).
11.30, 1.10 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.10, 18.25, 2.00 «Сляпая» (16+).
14.05, 19.25, 2.50 «Варажбітка» (16+).
15.00 «Старац» (16+).
15.30 «Самыя загадкавыя здарэнні» (16+).
16.25, 3.40 «Знакі лёсу» (16+).
17.25 «Якія вярнуліся» (16+).
20.25 «Вайна міроў» (16+).
22.25 «Блэйд-2» (16+).
0.20 «Гарадскія легенды» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

ТБ1000

5.05, 5.45, 17.20, 18.10 Элементарна (16+).
6.25 Трывожны выклік (16+).
8.00 Пакой страху (16+).
10.00 Захавальнік часу (12+).
12.10 Востраў праклятых (16+).
14.40 Адступнікі (16+).
19.00 Таемнае акно (12+).
20.40 Словы (12+).
22.30 Вобласці цемры (16+).
0.20 Адзінаццаць сяброў Оўшэна (16+).

2.15 Дванаццаць сяброў Оўшэна (16+).
4.15 Трынаццаць сяброў Оўшэна (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Фіксікі (6+).
6.40 Смяшарыкі (6+).
8.15 Тры каты (6+).
9.20, 17.10 Ратуйце Колю! (12+)
11.05 (НЕ)ідэальны мужчына (12+).
12.35 Мужчына з гарантыяй (16+).
14.10 Дзённік маці першакласніка (6+).
15.35 Сняданак у таты (12+).

19.00 Сем вячэр (12+).
20.30 30 спатканняў (16+).
22.10 Я худзею (16+).
23.55 СуперБабровы (12+).
1.30 СуперБабровы. Народныя мсціўцы (12+).
2.55 Дзень сляпога Валянціна (16+).

National Geographic

6.00, 18.35, 19.00 Фабрыка ежы (16+).
6.25 Навуковыя глупствы (16+).
7.15, 8.05 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.55, 9.45 Суперзбудаванні (16+).
10.40, 11.25 Аўта-SOS (16+).
12.15, 13.00 Непакорны востраў (16+).
13.50, 14.35, 19.25, 20.10, 0.10, 0.55 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.20, 16.10, 1.45, 2.35 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
17.00 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
17.45 Панарама 360. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
21.00, 3.25 Антарктыка (16+).
21.45 Аляска: новае пакаленне (16+).
22.30 Дзіўны аэрапорт Нью-Ёрка (16+).
23.20 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
4.10 Суперзбудаванні: цуды інжынерыі (16+).
5.15 Гульні розуму (16+).

ЯСНАе

5.10 Серыял «Учора скончылася вайна» (12+).
6.40 Серыял «Скачок Багамола» (12+).
8.15 «Ясна аб міні-футболе».
8.45 Серыял «Дзяржаўная граніца» (12+).
10.30 Серыял «Афіцэры» (12+).
12.15 Маст. фільм «Аб'яўлены ў вышук» (16+).
14.05 Серыял «Па законах ваеннага часу» (12+).
15.55 Серыял «Паляванне на піранню» (16+).
17.30 Серыял «Балада аб бомберы» (16+).
19.15 Серыял «Крэмень. Вызваленне» (16+).
21.00 Інфармацыйны дайджэст «Час высокіх тэхналогій».
21.25 Маст. фільм «Паршывыя авечкі» (16+).
23.30 Маст. фільм «На раёне» (16+).
1.05 Маст. фільм «У тумане» (12+).
3.15 Серыял «Шэрлак Холмс» (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.00, 7.30, 8.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.20, 8.20 Навіны эканомікі.
7.25, 8.25, 18.15 Зона Х (16+).
9.10 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
10.00, 11.50, 12.15, 13.10 Драма «Авантура» (16+).
10.55 «Скажынемаўчы».
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
15.25, 20.45 «Фактар.BY».
15.30, 0.05 Серыял «След» (16+).
17.05, 18.40, 19.20 Драма «Мы ўсё роўна будзем разам» (12+).
20.00 Панарама.
23.10 Клуб рэдактараў (16+).
1.45 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
10.00, 16.55 Тэлебарометр.
10.05 «Сакрэты» (16+).
11.05 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).
12.40 Серыял «Доктар Надзея» (12+).
14.30, 20.10 Драма «ІП Пірагова» (16+).
15.25 М/с «Маша і Мядзведзь» (0+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
17.00 «На нажах» (16+).
19.00 «Дарагая, я забіў» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
21.20 Трылер «Найлепшая прапанова» (16+).
23.30 «Я з вёскі» (12+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня».
8.05, 12.05, 16.40, 20.30, 23.40 Навіны культуры.
8.15, 18.25 «Арлова і Аляксандраў». Серыял (16+) [СЦ].
10.05 «Жывая спадчына».
10.30, 17.45 «Апошні дзень» (12+) [СЦ].
11.05, 16.50 «Браты Карамазавы». Серыял (16+) [СЦ].
12.15 «Сіла веры».
12.40 «Сваімі словамі».
13.20 «Спецыяльны культурны рэпартаж».
13.50 «Прысвячэнне маэстра».
14.50, 21.05 «Джульбарс». Серыял (12+) [СЦ].
20.10, 23.50 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
20.40 «Калыханка» (0+).
22.50 «Кадры жыцця».

Беларусь 5

7.00 Хакей. КХЛ. «Ак Барс» (Казань) — СКА (Санкт-Пецярбург).
8.55 Сняданак чэмпіёна.
9.25 Хачу стаць...
9.55 Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Сібір» (Новасібірск).
11.50 Футбол. Чэмпіянат Іспаніі.
13.45 Канькабежны спорт. Чэмпіянат Беларусі.
15.05 Самба. Чэмпіянат свету.
17.15 Авертайм.
17.50 Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. БЧ (Гомель) — ВітЭн (Орша).
19.50 Футбол. Кубак Беларусі. ФК «Гомель» — «Белшына» (Бабруйск).
21.50 Планета спорту.
22.10 Змешаныя адзінаборствы. UFC.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
10.00 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 Серыял «Залатая клетка» (16+).
13.15, 22.45 Серыял «Міндальны прысмак кахання» (16+).
16.20 Інфармацыйны канал (16+).
17.30 «Трывожная кнопка» (16+).
18.20 «Народны ДАСТ» (12+).
18.55 «Удача ў прыдачу» (12+).
19.00 «Поле цудаў» (16+).
20.10 Вячэрнія навіны.
21.15 «Лаўроў. За гранню» (16+).
21.20 «Што? Дзе? Калі?» (16+)
0.55 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 11.30, 13.45 Дак. праект (16+).
10.40 «Акадэмія». Серыял (12+).
15.25, 17.20, 1.10 «Мечаны». Серыял (16+).
16.50 «Рашэнне ёсць!»
20.10, 23.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Сталічныя падрабязнасці».
20.25 «Міншчына».
20.40 «Народны кантроль».
20.55 «Ілюзія падману» (12+).
23.10 «Ілюзія падману-2» (12+).

МІР

5.00 Серыял «Меч» [СЦ] (16+).
6.00, 10.20 Серыял «Меч-2» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 18.30 Навіны (бягучы радок).
10.10 «У гасцях у лічбы» (12+).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.05, 16.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.10, 17.55 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.05 «Міравое пагадненне» (16+).
18.50 «Слабае звяно» (12+).
19.40 Маст. фільм «Гараж» [СЦ] (12+).
21.35 Маст. фільм «Жорсткі раманс» [СЦ] (12+).
0.15 Маст. фільм «Жаніцьба Бальзамінава» [СЦ] (6+).
1.45 Маст. фільм «Цырк» [СЦ] (0+).
3.15 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
3.40 Мультфільмы (6+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.40 «Кропкі над і» (16+).
14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
14.40 «60 хвілін» (12+).
17.40 «Лёс чалавека з Барысам Карчэўнікавым» (16+).
18.55 «Малахаў» (16+).
21.30, 23.15 Фільм «Без кахання» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.15, 8.20, 13.30, 16.40, 20.00, 22.35, 23.45 Сёння. Галоўнае.
6.10 «Здорава здаровым быць!» (6+)
7.00 Сфера інтарэсаў.
7.30 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 21.20 «НЗ.by».
8.55 «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
9.10 Серыял «Смерць у аб'ектыве» (16+).
10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Лёсы» (16+).
12.20, 14.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).
13.35 Надзвычайнае здарэнне.
16.50 «ДНК» (16+).
18.00 «Чакай мяне» (12+).
20.15, 21.45 Дэтэктыў «Спецбат» (16+).
22.50, 0.00 Серыял «Хуткая дапамога» (16+).

8 канал

7.00, 15.35, 19.00, 21.05, 2.20 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Захавальнік леў» (0+).
7.30 Дзіцячы серыял «Хачу ў кіно» (6+).
7.40 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).
8.25 Дак. серыял «Вяршыні свету».
9.10 Серыял «Ратавальнікі Малібу» (12+).
09.50 Драма «Крамер супраць Крамера» (12+).
11.40 Драма «Тры білборды на граніцы Эбінга, Місуры» (18+).
13.40 Драма «Салодкі ліставад» (12+).
15.40 «Прыколы 13-й школы» (6+).
15.45 Мультпарад. «Шахеразада» (6+).
16.30 Камедыя «Шапаголік» (16+).
18.20 Серыял «Каварныя пакаёўкі» (16+).
19.05 Дэтэктыў «Кандыс Рэнуар» (18+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.10 «Героі коміксаў на экране». «Цёмны рыцар» (16+).

ВТВ

6.00 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45 «Лаві момант» (16+).
11.45, 23.20 «КВЗ. Панашаму» (16+).
13.00, 2.35 «Проста кухня» (16+).
13.50 «Уральскія пельмені» (16+).
14.45, 0.00 Серыял «Два бацькі і два сыны» (16+).
15.40 Серыял «Варонiны» (12+).
17.25 Серыял «Кухня» (16+).
19.10 Серыял «Пастукайся ў мае дзверы» (16+).
20.00 Серыял «Карані» (16+).
21.00 Камедыя «Мама Мія!» (12+)
22.50 «Велабайкі» (16+).
0.55 Серыял «Маладзёжка» (16+).
3.25 «Адна за ўсіх» (16+).
4.15 «6 кадраў» (16+).
5.10 Серыял «Ранеткі» (12+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35 «Бастыёны ўлады». Дак. фільм [СЦ].
8.35, 18.45 Колер часу.
8.45, 16.35 «Асабістае шчасце». Маст. фільм.
10.15 «Назіральнік».
11.10, 0.00 ХХ стагоддзе.
12.20 «Забытае рамяство».
12.35, 22.15 «Запомніце мяне такой». Маст. фільм [СЦ].
13.45 Юбілей Іны Салаўёвай.
14.30 «Гісторыя рускага побыту». Дак. серыял [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Кіно.
15.20 «Біблейскі сюжэт».
15.50 «Белая студыя».
17.50, 2.05 Вакалісты.
19.00 Жыццё выдатных ідэй [СЦ].
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Правілы жыцця».
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.50 «Абсалютны слых».
21.30 Астравы [СЦ].
23.20 «Першыя ў свеце».
1.10 «Вялікая французская рэвалюцыя». Дак. фільм [СЦ].

Настальгія

6.00 «СевАлогія» (18+).
6.55, 8.40, 9.40, 11.30, 12.55, 14.40, 15.40, 17.30, 20.15, 21.40, 23.30, 0.55, 2.45, 3.40, 5.30 Музычная настальгія (12+).
7.20 Маст. фільм «Брунетка за 30 капеек» (18+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР». (12+).
11.00, 17.00, 23.00, 5.00 «Блеф-клуб» (18+).
12.00 «Быў час» (16+).
13.10 Маст. фільм «Ноч у Касабланцы» (16+).
18.00 «Спяем, сябры!» (12+)
18.55 Маст. фільм «Калі б ведаць...» (18+)
0.00 Дак. фільм «Жыццё і незвычайныя прыгоды Уладзіміра Вайновіча» (16+).
1.10 Маст. фільм «Крамачка за вуглом» (16+).

EuroSport 1

3.00 Горныя лыжы: кубак свету, Цюрс. Мужчыны (6+).
3.30, 7.00, 10.35, 15.00, 15.45, 21.00, 21.45 Снукер: UK Championship (6+).
5.00 Горныя лыжы: кубак свету, Цюрс. Жанчыны (6+).
6.00, 14.00 Веласпорт-трэк: Ліга чэмпіёнаў, Мальёрка (6+).
8.30, 9.00, 12.30 Кузаўныя аўтагонкі: кубак свету, Бахрэйн. Другая гонка (6+).
9.30, 13.00 Аўтагонкі на выносливасць: чэмпіянат свету «8 гадзін Бахрэйна» (6+).
19.35 Конны спорт (6+).
20.30 Парусны спорт (6+).
1.30 Гольф. Тэлечасопіс Discovery Golf (6+).
2.00 Паўэрліфтынг: чэмпіянат свету (6+).

Кінакамедыя

0.50 Так сабе канікулы (6+).
2.25 Кахаю цябе, чувак (16+).
4.10 Скінь маму з цягніка (12+).
5.45 Шалёна закаханы (16+).
7.40 Касталом (16+).
9.35 Легенда Зора (6+).
12.00 Канваіры (16+).
13.50 Каханне і іншыя непрыемнасці (16+).
15.40 Спадарыня пакаёўка (12+).
17.35 Дзікая парачка (16+).
19.30 Беласнежка: помста гномаў (12+).
21.20 Выкідала (18+).
23.00 Нічога не бачу, нічога не чую (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.35, 22.35 «Анатомія забойства» (16+).
11.10 «Перыскоп» (16+).
11.30 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.10, 19.35, 3.00 «Сляпая» (16+).
14.10, 20.35 «Варажбітка» (16+).
15.10, 17.40, 3.45 «Паралельны свет» (16+).
16.05 «Старац» (16+).
16.35 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
18.40 «Трынаццаць» (16+).
21.35 «Непрыгожая сяброўка» (12+).
0.15 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
1.05 «Блэйд» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

ТБ1000

5.30, 6.05, 17.20, 18.10 Элементарна (16+).
6.55 Змешаныя (12+).
8.55 Мільянер паняволі (12+).
10.30 Клік: з пультам па жыцці (12+).
12.25 Ізгой (12+).
15.00 Капітан Філіпс (16+).
19.00 Інтуіцыя (12+).
20.35 Дом каля возера (12+).
22.25 Бойфрэнд з будучыні (16+).
0.30 Трывожны выклік (16+).
2.00 Пакой страху (16+).
3.50 Забытае (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Фіксікі (6+).
6.15 Смяшарыкі (6+).
7.10 Тры каты (6+).
8.05 СуперБабровы (12+).
9.40 СуперБабровы. Народныя мсціўцы (12+).
11.10 Сардэчна запрашаем у сям'ю (16+).
13.15 Пальма (6+).
15.15 Пара з будучыні (12+).
17.05, 18.00 Жоўтае вока тыгра (16+).
19.00 Шчасця! Здароўя! (16+)
20.25 Дзень сляпога Валянціна (16+).
22.30 Стаўка на каханне (12+).
0.05 Love (18+).
1.35 Сем вячэр (12+).
3.00 Сямейны бюджэт (12+).

National Geographic

6.00, 18.35, 19.00 Фабрыка ежы (16+).
6.30 Навуковыя глупствы (16+).
7.20, 8.05 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.55, 9.45 Супердомабудаванні (16+).
10.35, 11.25 Аўта-SOS (16+).
12.15, 13.00 Непакорны востраў (16+).
13.45, 14.35, 19.25, 20.10, 0.15, 1.00 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.20, 16.10, 1.50, 2.40 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
17.00, 17.25 Зрабіць за адзін дзень (16+).
17.45 Панарама 360. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
21.00, 3.25 Апошнія волаты: дзікая рыба (16+).
21.45 Інстынкт выжывання: уцёкі з Амазоніі (16+).
22.35, 23.25 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
4.15 Унутры неверагоднай механікі (16+).
5.15 Гульні розуму (16+).

ЯСНАе

5.05 Серыял «Учора скончылася вайна» (12+).
6.35 Серыял «Далёка ад вайны» (16+).
8.25 Серыял «Дзяржаўная граніца. «На далёкім пагранічча» (12+).
10.40 Серыял «Крот» (16+).
12.25 Серыял «Мы з будучыні» (12+).
14.00 Серыял «Па законах ваеннага часу» (12+).
15.45 Маст. фільм «У жніўні 44-га» (12+).
17.35 Серыял «Ваенная разведка: Паўночны фронт» (16+).
19.15 Серыял «Крэмень» (16+).
21.00 Дак. цыкл «Связісты».
21.25 Маст. фільм «Паравозчык-3» (12+).
23.10 Маст. фільм «Бык» (16+).
0.50 Маст. фільм «Мяне клічуць Арлекіна» (16+).
3.00 Маст. фільм «Рускі» (6+).
3.30 Серыял «Шэрлак Холмс» (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

чацвер, 17 лістапада ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.20 Зона Х (16+).
9.10 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
10.00, 11.45, 12.15, 13.05 Драма «Прыватнае жыццё» (16+).
10.50, 0.55 «Скажынемаўчы».
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
15.25 «Фактар.BY».
15.30, 22.25 Серыял «След» (16+).
17.05 Беларуская часінка (прамы эфір).
18.35, 19.20 Драма «Позні тэрмін» (16+).
21.00 Панарама.
21.40 «Санкцыі для народа». Тэлефільм АТН (12+).
22.00 Адзін дзень (12+).
0.00 Сфера інтарэсаў.
0.35 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
10.00, 16.55 Тэлебарометр.
10.05 Серыял «Сляпая» (16+).
10.35, 18.40 «Сакрэты» (16+).
11.05, 17.00 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).
12.40, 20.40, 21.15 Серыял «Доктар Надзея» (12+).
14.30, 19.40 Драма «ІП Пірагова» (16+).
15.25 М/с «Маша і Мядзведзь» (0+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
22.40 «Гаспадыня лёсу». Серыял (16+).
23.35 «На кручку» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.15 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 16.40, 20.30, 23.45 Навіны культуры.
8.15, 18.25 «Арлова і Аляксандраў». Серыял (16+) [СЦ].
10.00 «Жывая спадчына».
10.30, 17.45 «Апошні дзень» (12+) [СЦ].
11.05, 16.50 «Браты Карамазавы». Серыял (16+) [СЦ].
12.40 «Сваімі словамі».
13.20 «Я сэрца аддам Беларусі». Юбілейны канцэрт мастацкага кіраўніка ансамбля «Свята» Вячаслава Статкевіча.
14.50, 21.05 «Джульбарс». Серыял (12+) [СЦ].
20.10, 23.55 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
20.40 «Калыханка» (0+).
22.50 «Кадры жыцця».

Беларусь 5

7.00 Хакей. Кубак Будучыні. Беларусь (U-20) — Расія (U-20).
8.55 Між іншым.
9.15 Футбол. Таварыскі матч (U-21). Беларусь — Іран.
11.10 Слэм-данк.
11.40 Хакей. Кубак Будучыні. Расія (U-18) — Казахстан (U-20).
13.40 Канькабежны спорт. Чэмпіянат Беларусі.
14.50 Самба. Чэмпіянат свету.
16.30 Футбол. Чэмпіянат Расіі. «Тарпеда» (Масква) — «Зеніт» (Санкт-Пецярбург).
18.30, 21.30 Спорт-цэнтр.
18.40 Авертайм. КХЛ.
19.00 Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Сібір» (Новасібірск).
21.40 Фактар сілы.
22.10 Змешаныя адзінаборствы. UFC.

АНТ

6.00, 7.15, 8.15 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
7.10, 8.10 «Трывожная кнопка» (16+).
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 Серыял «Залатая клетка» (16+).
13.15, 23.15 Серыял «Міндальны прысмак кахання» (16+).
16.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
20.10 Вячэрнія навіны.
21.15 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
22.00 Серыял «Ахвяра кахання» (16+).
1.25 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 11.30, 13.45 Дак. праект (16+).
10.40 «Акадэмія». Серыял (12+).
11.45 «Афіцэры-2. Адзін лёс на дваіх». Серыял (12+).
15.55, 16.50, 23.10 «Мечаны». Серыял (16+).
20.15, 23.05 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Мінскчына».
20.40 «Паляўнічыя на брыльянты». Серыял (12+).

МІР

5.00 Мультфільмы (6+).
5.30, 10.10 Серыял «Даішнікі-2» [СЦ] (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 18.30 Навіны (бягучы радок).
13.15, 17.55 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.05, 16.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.10 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.05 «Міравое пагадненне» (16+).
18.50, 19.30, 20.05 «Гульня ў кіно» (12+).
20.50 «Слабае звяно» (12+).
21.40 «Назад у будучыню» (16+).
22.35 Серыял «Меч-2» (16+).
1.05 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
1.30 Маст. фільм «Варатар» [СЦ] (0+).
2.40 Серыял «Меч» [СЦ] (16+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.45 «Кропкі над і» (16+).
14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
14.40 «60 хвілін» (12+).
17.40 «Лёс чалавека з Барысам Карчэўнікавым» (16+).
18.55 «Малахаў» (16+).
21.30 Серыял «Баранцава мора» (16+).
22.30, 23.15 Серыял «Мароза-ва» (16+).
23.35 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.15, 8.20, 13.30, 16.40, 20.00, 22.35, 23.40 Сёння. Галоўнае.
6.10 «Здорава здаровым быць!» (6+)
7.00 Сфера інтарэсаў.
7.30 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 21.20 «НЗ.by».
8.55 «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
9.10 Серыял «Смерць у аб'ектыве» (16+).
10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Лёсы» (16+).
12.20, 14.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).
13.35, 16.50 Надзвычайнае здарэнне.
17.10 «За гранню» (16+).
18.05 «ДНК» (16+).
20.15, 21.35 Дэтэктыў «Спецбат» (16+).
22.40, 23.55 Серыял «Хуткая дапамога» (16+).

8 канал

7.00, 15.35, 18.45, 21.10, 1.00 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Захавальнік леў» (0+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).
8.20 «Дакументальны экран».
8.50 Серыял «Ратавальнікі Малібу» (12+).
9.30 «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан» (12+).
12.00 Камедыя «Каштоўнасці сямейкі Адамс» (12+).
13.35 Драма «Дарагія таварышы» (16+).
15.40 Дзіцячы серыял «Хачу ў кіно» (6+).
15.50 Мультпарад. «Шахераззада» (6+).
16.20 Камедыя «Жасмін» (16+).
18.00 Серыял «Каварныя пакаёўкі» (16+).
18.50 Дэтэктыў «Кандыс Рэнуар» (18+).
20.45 «Вечарніца» (0+).
21.00 «Салям алейкум, Беларусь!»
21.15 Трылер «Мыс страху» (16+).
23.20 Драма «Крамер супраць Крамера» (12+).

ВТВ

6.00, 12.30 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45 «Лаві момант» (16+).
11.45, 23.55 «КВЗ. Панашаму» (16+).
13.00, 2.35 «Проста кухня» (16+).
13.50 «Уральскія пельмені» (16+).
14.45, 0.00 Серыял «Два бацькі і два сыны» (16+).
15.40 Серыял «Вароніны» (12+).
17.25 Серыял «Кухня» (16+).
19.10 Серыял «Пастукайся ў мае дзверы» (16+).
20.00 Серыял «Карані» (16+).
21.00 Мюзікл «Ла-ла лэнд» (12+).
23.15 «Наш рамонт» (16+).
0.55 Серыял «Маладзёжка» (16+).
3.25 «Адна за ўсіх» (16+).
4.15 «6 кадраў» (16+).
5.10 Серыял «Ранеткі» (12+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35, 1.05 «Вялікая французская рэвалюцыя». Дак. фільм [СЦ].
8.35, 12.15 Колер часу.
8.50, 16.35 «Асабістае шчасце». Маст. фільм.
10.15 «Назіральнік».
11.10, 0.00 XX стагоддзе.
12.35, 22.15 «Запомніце мяне такой». Маст. фільм [СЦ].
13.45 «Пад знакам Ільва». Дак. фільм [СЦ].
14.30 «Гісторыя рускага побыту». Дак. серыял [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Тэатр.
15.20 Пернікавы домік [СЦ].
15.50 «2 Вернік 2».
17.50, 2.00 Вакалісты.
18.40 «Забытае рамяство».
19.00 Жыццё выдатных ідэй [СЦ].
19.45 «Галоўная роля».
20.05 Адкрытая кніга [СЦ].
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.50 Кіно пра кіно [СЦ].
21.30 «Энігма. Дзмітрый Сінькоўскі».
23.25 «Першыя ў свеце».

Настальгія

6.00 «Быў час» (16+).
6.55, 8.40, 9.40, 11.30, 14.15, 15.40, 17.30, 19.00, 20.35, 21.40, 23.30, 0.55, 2.40, 3.40, 5.30 Музычная настальгія (12+).
7.10 Маст. фільм «Ноч у Касабланцы» (16+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.00, 17.00, 23.00, 5.00 «Блеф-клуб» (18+).
12.00 «Спяем, сябры!» (12+)
12.55 Маст. фільм «Калі б ведаць...» (18+)
18.00 «Яловая субмарына» (16+).
19.20 Маст. фільм «Сваёй» (18+).
0.00 «СевАлогія» (18+).
1.20 Маст. фільм «Брунетка за 30 капеек» (18+).

EuroSport 1

3.30, 7.00, 10.30, 15.00, 15.45, 21.00, 21.45 Снукер: UK Championship (6+).
5.00, 9.30 Горныя лыжы: кубак свету, Цюрс. Мужчыны (6+).
6.00, 1.30 Аўтагонкі на выносліваць: чэмпіянат свету «8 гадзін Бахрэйна» (6+).
8.30, 2.30 Горныя лыжы: кубак свету, Цюрс. Паралельны слалам. Жанчыны (6+).
12.30 Парусны спорт: Дубай (6+).
13.00 Гольф. Тэлечасопіс Discovery Golf (6+).
13.30, 20.00 Паўэрліфтынг: чэмпіянат свету (6+).
19.30 Усе віды спорту (6+).

Кінакамедыя

0.55 Дзе мая тачка, чувак? (12+)
2.20 Год свінні (16+).
3.45 Так сабе канікулы (6+).
5.25 Маска Зора (12+).
7.55 Апошні водпуск (12+).
10.00 Нічога не бачу, нічога не чую (16+).
11.55 За бортам (12+).
14.00 Як ажаніць прыгажуна (16+).
15.45 Беласнежка: помста гномаў (12+).
17.40 З 13 у 30 (12+).
19.30 Джуманджы (6+).
21.20 Мая супербылая (16+).
23.10 Дзікая парачка (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.25, 22.30 «Анатомія забойства» (16+).
11.00 «Улецы» (16+).
11.30 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.10, 19.35, 2.50 «Сляпая» (16+).
14.10, 20.35, 3.40 «Варажбітка» (16+).
15.10, 17.40 «Паралельны свет» (16+).
16.05 «Старац» (16+).
16.35 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
18.40 «Трынаццаць» (16+).
21.35 «Непрыгожая сяброўка» (12+).
0.10 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
1.00 «Адзінаццаць сяброў Оўшэна» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

ТБ1000

5.20, 6.00, 17.20, 18.10 Элементарна (16+).
6.55 Адзінаццаць сяброў Оўшэна (16+).
9.00 Дванаццаць сяброў Оўшэна (16+).
11.10 Трынаццаць сяброў Оўшэна (16+).
13.20, 3.30 Дом каля возера (12+).
15.10 Бойфрэнд з будучыні (16+).
19.00 Захавальнік часу (12+).
21.10 Вастраў праклятых (16+).
23.40 Адступнікі (16+).
2.10 Інтуіцыя (12+).

Рускае кіно

5.30 Фіксікі (6+).
6.40 Смяшарыкі (6+).
8.30 Тры каты (6+).
9.50, 2.35 Яна+Янка (12+).
11.30 Стаўка на каханне (12+).
13.05 Дзень сляпога Валянціна (16+).
15.10 Сямейны бюджэт (12+).
17.05, 18.00 Жоўтае вока тыгра (16+).
19.00 Ратуйце Колю! (12+)
20.40 (НЕ)ідэальны мужчына (12+).
22.15 Мужчына з гарантыяй (16+).
23.50 Дзённік маці першакласніка (6+).
1.10 Сняданак у таты (12+).
4.05 Кахае не кахае (16+).

National Geographic

6.00, 18.35, 19.00 Фабрыка ежы (16+).
6.25 Навуковыя глупствы (16+).
7.15, 8.05 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.55, 9.45 Супердзубаванні (16+).
10.35, 11.25 Аўта-SOS (16+).
12.15, 13.00 Непакорны вастраў (16+).
13.45, 14.35, 19.25, 20.10, 0.15, 1.00 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.20, 16.10, 1.50, 2.40 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
17.00 Апошнія волаты: дзікая рыба (16+).
17.45 Панарама 360. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
21.00, 3.25 Супердзубаванні Трэцяга рэйха (16+).
21.45 Нераскрытыя таямніцы Другой сусветнай вайны (16+).
22.35, 23.25 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
4.15 Супердзубаванні: цуды інжынерыі (16+).
5.10 Гульні розуму (16+).

ЯСНАе

5.00 Серыял «Учора скончылася вайна» (12+).
6.35 Серыял «Скачок Багамола» (12+).
8.10 «Ясна аб футболе».
8.45 Серыял «Дзяржаўная граніца» (12+).
10.35 Серыял «Крот» (16+).
12.25 Серыял «Мы з будучыні» (12+).
14.00 Серыял «Па законах ваеннага часу» (12+).
15.50 Серыял «Паляванне на піранню» (16+).
17.25 Серыял «Балада аб бомберы» (16+).
19.15 Серыял «Крэмень» (16+).
21.00 «У адкрытым доступе».
21.30 Маст. фільм «Бітва за Севастопаль» (12+).
23.30 Маст. фільм «Загад» (0+).
1.45 Маст. фільм «Сляды апосталаў» (12+).
3.40 Серыял «Шэрлак Холмс» (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

ПІЦЦЁ — СМЯЦЦЁ, ПАСЯДЗЁНКА — ДОРАГА, альбо І хітры ліс у пастку трапляе

...Дзень пачынаўся проста цудоўна! Ён, па-першае, быў выхадным, па-другое, два сябрукі сышлі з дому і, яшчэ на досвітку злавіўшы некалькі жыўцоў, разняволена сядзелі на беразе Аржаніцы, на так званым віры — чакалі шчупакоў...

Нават больш за тое — чакалі іх зусім нядоўга! Можа, з паўгадзінкі прайшло, як Іванаў кручок нырнуў у ваду, як на ім, тут жа, адчулася нешта вялікае. Рукі спацелі ўмомант! «Трэба, трэба супакоіцца, — сам сабе загадваў Іван. — Трэба цяпер вельмі пакрыху-памалу, асцярожненька, спакваля».

Вудзільна між тым сагнулася, потым больш, яшчэ больш... «Лёска... Толькі б не парвалася! Толькі б не падвяла... Ага, трымае... Трымае!» — цешыўся Іван.

Над гладдзю вады ўжо мільганула знаёмая пашча, потым — ледзь не ўся шчупакова галава (а ўжо ж вялікая, шэра-зялёная!), на імгненне паказалася частка тулава і — прычым тут жа! — знікла (!!!), бо ён, вудзільшчык задрыпаны (мацюкі не для друку), не ўтрымаўся: рана тузануў.

...Толькі сапраўды (а не такі вось рыбак) можа зразумець, што тады адчуваеш і ЯК тады хочацца выпіць!

У сяброў, што называецца, з сабою было, і яны з гора тут жа «накацілі».

Але ж пляшка віна адна, паўлітровая...

Пасля яе Іван успомніў, што ўчора, шукаючы свае рыбацкія боты, перастаўляў валёнкі і ў адным жонка схавала бутэльку «Пшанічнай».

Зганяў дамоў, прынёс. Сябры выпілі і потым, відаць, забыліся б, бы тут Івану тэлеграма ад дачкі прыйшла (тэлефонаў не было нават у суседзяў): сустракайце, маўляў. Прыеду ў нядзелю. І не адна.

Бацькі да гэтага — ішлі размовы — трохі падрыхтаваныя былі — зразумелі: прыедзе з будучым зяцем. І ім, маладым, тады што — тэлеграму далі і жыві да нядзелі. А сям'і — воз думак ды клопатаў: як сустрэць таго чужога чалавека, як найлепей прыняць ды яшчэ ў пару дэфіцыту...

Нешта ў мясцовай краме дасталі, па нешта ў райцэнтр з'ездзілі. Больш спадзяваліся на сваё: карову трымалі, свіней, зямлю даглядалі, у цяпліцы штось вырасла...

Стол, карацей, атрымаўся на славу: з-за талерак абруса не відаць было! Кандыдат у зяці, гараджанін, на вясковае ўсё налягаў: на мачанку з грыбамі, на калдуны з сушанымі яблыкамі, на тушаную фасолю...

І спіртнога ў рот не браў, бо за рулём, што яшчэ больш цешыла цешчу...

А вось цесця, як выглядала, раздражняла ўсё: як падмянілі чалавека! Жонка з дачкой глядзелі на яго і вачам не верылі: выпіў адзін амаль цэлую пляшку «Пшанічнай» і нічым не закусіў. А галоўнае, за сталом сядзеў як на хаўтурах: зацята маўчаў ды цяжка ўздыхаў.

— Мама, што гэта з ім? — цішком спытала дачка. — То ён ад чаркі і пажартуе, і нешта скажа, а то як вады ў рот набраў. Можа, яму зяць не даспадобы?

А маці і рада б ёй адказаць, ды сама не разумее: нездаровіцца чалавеку, ці што?.. Апошнюю стаграмоўку нават не дапіў...

Перш чым выліць тое, што засталося, у слоічак на кампрэс, гаспадыня, мыючы посуд, машынальна нюхнула чарку. Гарэлкай там чамусьці не пахла. Паспытала — так і ёсць — вада...

І тут — шчыра пасмяяўшыся — жанчына ўспомніла, як муж з пустымі рукамі, але «шчаслівы» прыйшоў з рыбалкі, як яна спыталася, што пілі, і ён, у бок адвёўшы вочы, сказаў, што ў іх з Пятром была пляшка віна...

Яна тады здзівілася, што ад паўлітра іх гэтак развезла...

Цяпер жа зразумела ўсё: гаспадар знайшоў яе хованку, выпіў з сябрам гарэлку, у бутэльку наліў вады...

Прызнавацца ў тым (ды яшчэ пры гасцях) зусім не выпадала, вось і куляў за сталом вадзіцу з уласнай студні!

...Але ж потым, недзе праз месяц, душу адвёў: добра-ткі насцёбаўся (і добрай гарэлкі!) — у дачкі на вяселлі.

Іван Букоўскі,
в. Шуневічы, Глыбоцкі раён.

ДОБРЫ ЗЛОДЗЕЙ, БО СВОЙ

Гэту праўдзівую гісторыю мне расказала мая блізкая сваячка, яна ж — родная сястра галоўнага «героя». Мне заставалася толькі запісаць, што аднойчы, увосень...

Іван, прыставіўшы драбіны,
Палез той дзень
з вядзерцам гліны
Падмазаць
комін на гарышчы,
А то ж, палохалі: згарыш ты...

Пашоргаў ён аб цэглу кельняй.
Здаецца, усё зрабіў нарэшце?
І тут адчуў Іван, што вельмі ж
Яго прываблівае нешта.

Не куфар. Не адзежын колькі...
Ад коміна
якіх тры крокі
Скромнае, з Калядак, кольца
Падвешана было за кроквы.

Каўбаска тая — бяражонка,
Хоць надламаная ўжо крышку.
«Не ўздумай!..» — загадала жонка.
І Янка ведаў: будзе крыку!

Недатыкальным стаў ласунак
З прычыны важнай і адной:
Ён — лесніку на пачастунак,
Той абяцаў быў сухастой...

Унізе зарыпелі дзверы.
— Я мігам, я па хлеб у краму,
А то не хопіць на вячэру, —
Пачуў ад жонкі —
ужо з-за брамы...

І штось кальнула
пад рабрыну:
Пакуль няма ягонай Лёдзі,
Пакуль ідзе да магазіна,
То паспяшацца не пашкодзіць:

Каўбаскі адламаў з аглядкай —
І ўніз...
Апошняя прыступка...
Як быццам бы
прайшло ўсё гладка?
Ды...
За дзвярыма нечы тупат?

Скароміна
ледзь з рук не выпала!
І нервы сцяліся ў трывозе:
Адзін
на сотню тысяч выпадак:
Стаяла жонка на парозе.

Ажно пад лыжачкай занылa,
Што недарэчна так папаўся!
— Пайшла, а гаманец забыла...
Во галава дурная...
(Паўза).

Застыла жонка ва ўтрапенні
(Нямая сцэна з «Рэвізора»),
У Вані
дрыжыкі ў каленях,
Сам —
і разгубленасць, і сорам.

Вось так: што маеш, тое маеш.
Слоў — апраўдацца — бракавала.
— На во табе! —
Ён, адламаўшы,
І Лёдзі даў адзін кавалак.

Мікалай Камароўскі,
г. Орша.

ЖАЛЕЗНАЕ ПРАВІЛА ВЁСКІ

Да сваіх сарака і яшчэ пяці я праносіла досыць доўгую касу. Потым дочкі пераканалі, што жанчынам ва ўзросце з кароткімі валасамі прыгажэй, і завялі ў цырульню да сваёй знаёмай.

Верачка і сапраўды аказалася майстрыхай на стрыжкі і прыветлівай, мілай жанчынай. Вось і нядаўна я заходзіла да яе — па дарозе з рынку, з двума немалымі пакетамі.

— Вы сёння як наша Данілаўна, — убачыўшы іх, сказала Вера.

Я, вядома ж, папыталася, хто гэта, і пачула досыць цікавую гісторыю.

У тую раніцу кліентаў у цырульні амаль не было (гараджане любяць паспаць), а вось бліжэй да абеду — нават чарга з'явілася... Адзін чалавек (там яшчэ і мужчыны стрыгуцца) з крэсла ўставаў, другі — амаль тут жа садзіўся. Каб трохі адпачыць ды агледзецца, у майстрых ніякай хвіліны не было... А тады, калі яна з'явілася, Вера заўважыла, што ў куце пад вешалкай стаіць немаленькі і поўны пакет. «Нехта нешта забыўся, — вырашылі дзяўчаты. — Зараз, напэўна, успомніць і забярэ».

Аднак прайшла гадзіна, потым другая, трэцяя, завяршаўся рабочы дзень, а па «торбу» ніхто не ішоў. «Ну не міліцыю ж да яе выклікаць», — падумалі майстрыхі і самі зазірнулі ўнутр. Зверху ў пакеце бялела нейкая паперка. Думалі, з адрасам. Аказалася — не, з кароткім: «Ешце на здароўе!»

Каму адрасавалася пажаданне, думаць не хацелася, бо...

Грушы ў пакеце былі такія...

Вырашылі з'есці — па адной, бо вунь жа іх колькі! А заадно — «перабраць» усіх сваіх сённяшніх кліентаў: вылічыць, хто з іх мог забыцца пакет?

...Здагадка прыйшла да Веры. Яна ўспомніла, што рабіла стрыжку пажылой жанчыне, валасы ў якой — пышныя, амаль няўлоўныя (твары, казала, ёй запамінаюцца горш), — вельмі напаміналі... дзіцячыя. Што тая жанчына была ў яе крэсле не ўпершыню, і ў мінулы раз, выпадкова пачуўшы, што ў майстрых ні дач, ні бабуль у вёсках, шчыра пашкадавала іх, нават спытала, як жа яны жывуць, калі нічога свайго, калі ўсё чыста трэба купіць? На што?..

У журнале для папярэдніх запісаў быў нумар тэлефона гэтай кліенткі, яе імя. Вера тут жа набрала патрэбныя лічбы — напомніла пра забыты пакет.

— Дык я ж яго вам прывезла! Ешце... — сказала жанчына.

А потым яшчэ і дадала, што сама яна родам з вёскі, што ў іх там дом, сад з вялікім агародам і... «жалезнае правіла» — дзяліцца тым, што вырасла, частаваць і знаёмых, і незнаёмых. Вось таму яна і частуе.

Добрая душа!

...Але ж мне ў гэтай гісторыі асабліва канец спадабаўся.

— Раней, — прызналася Вера, — я чула зняважлівыя словы «сяло», «дзярэўня» і як бы не чула — прапускала міма вушэй. Цяпер іх я нікому не дарую...

Дзеля таго варта ж было прывезці з вёскі торбу груш?

Таццяна Гаўрыльчык,
г. Мінск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

ЗАКРЫЦЦЁ СЕЗОНА

Дзейсны сродак ад восеньскай дэпрэсіі

У лістападзе, у туманна-вільготных прыцемках, усё хочацца рабіць павольна — не хутчэй, чым паўзе па шыбе кропля, — не ад дажджу, а ад таго ж густога туману. А яшчэ — пасядзець на любімай канапе з кубкам гарачай какавы, ахінуўшыся пледам, «абклаўшыся» катамі, паглядзець які стары добры фільм. І яно ўсё ў наяўнасці: і какава, і канапа, і плед, і тэлевізар. І нават каты (два штукі). А не выпадае. Нават на выхадныя. Таму што — закрыццё сезона. Дачнікі мяне разумеюць.

Што характэрна, гэта самае закрыццё як працэс зацягваецца больш чым на месяц. Хоць, калі раней назірала за гэтым збоку, а на нашай сядзібе ўсё грунтоўна і пакрысе рыхтавала на зіму старэйшая гаспадыня, якая з'язджала ў горад толькі на самы халодны час, здавалася: што там надта рабіць? Прыехаў на выхадныя, усё папарадкаваў, пазабіраў тое, што трэба, у горад, панавешваў на ўсе дзверы замкі — ды паехаў да наступнай вясны... Але калі сутыкаешся з гэтым асабіста і непасрэдна і заступіць сцежкі няма каму, робіш для сябе нечаканае адкрыццё: адных выхадных мала. І двух. І трох. Карацей, сезон будзе закрывацца да першага снегу, а можа, і даўжэй.

А САБЛІВА калі ён выдаўся такі, як сёлета, — ураджайны. Прынамсі яблыкі, памідоры і морква сёлета раслі як не ў сябе. Нават наша вялікая сям'я не ў сілах была ўсё спажыць. Яблыкі — крамяныя антонаўкі і чырванабокія каштэлі — ушасцёх збіралі па садзе паўдня (столькі насыпалася за тыдзень) і вазілі тачкай у капец за агародам. І гэта пры тым, што ўжо сабе набралі, хто колькі хацеў, і мясцоваму фермеру мяшкамі аддавалі, і суседзям, што толькі нядаўна ўчастак каля нас купілі, іх сад яшчэ расце. Дагэтуль у хляве стаяць скрыні з «бананавымі» — жоўтымі, салодкімі, але цвёрдымі, як дуб, бо даспяваюць яны бліжэй да новага года... Памідоры цягалі кашамі. Кетчуп варылі ў некалькі партый у вялікім чыгуне, слоікаў дваццаць паставілі па маміным любімым рэцэпце «пальчыкі абліжаш». А яны (памідоры) усё ніяк не заканчваліся. І тады вырашана было іх вяліць. Занятак, скажу я вам, так сабе: трэба ж рэзаць на акуратныя скрылікі, ставіць у духоўку на шэсць гадзін, яшчэ і назіраць, каб не перасохлі, бо павінны быць вяленыя — не сушаныя! Карацей, доўгімі восеньскімі вечарамі плед так і заставаўся ляжаць складзеным, а нягладжаныя каты дарэмна лісліва церліся аб ногі... Моркву разабралі па гарадскіх падвалах бы балконах, але цэлая выварка засталася, і яе ж трэба на зіму паставіць у склеп, перасыпаўшы пяском. Яшчэ адзін лішні клопат на выхадныя...

У выхадныя (дакладней, у суботу) пачынаецца сапраўдны трэш. Асабліва калі не маеш машыны і карыстаешся грамадскім транспартам. У сем гадзін раніцы — глухая цемра, а ў цябе звоніць будзільнік. Хуценька збіраешся, імчыш на маршрутку. Стараешся прыехаць на прыпынак раней, каб не тое што сесці — улезці. Пасля адмены льготнага праезду на прыгарадным аўтобусе маршрутка карыстаецца асаблівым попытам у пенсіянераў. Таму ў яе стараюцца ўбіцца ўсе: і бабулі з дубцамі і рукзакамі (таму што танней, чым на аўтобусе), і іншыя дачнікі (таму што хутчэй). І ўсім трэба закрываць сезон. Так і едзем, утаптаўшыся, бы апенькі ў слоіку. Вывальваешся праз сорак хвілін з маршруткі, глядзіш на гадзіннік («час пайшоў!»). На ўсё пра ўсё — крыху больш за пяць гадзін. Гэта з дарогай два кіламетры ў суседнюю вёску і назад. Начаваць ужо не выпадае: вялікую хату, якая за тыдзень моцна настые, вельмі цяжка за дзень абагрэць. Таму — бягом, каб паспець на апошнюю маршрутку, якая ідзе ў чатыры гадзіны...

А ДАМКНУЎШЫ цяжкія замкі, удыхнуўшы паветра роднай хаты — ніякае яно не «нежылое», як любяць казаць, проста халоднае і крыху вільготнае, найпершым чынам распальваеш печ. Не дзеля цяпла — дзеля таго, каб гэта самая печ не адсырэла і, крый божа, не правалілася (адзін з самых жудасных кашмараў кожнага вясковага домаўладніка, асабліва калі на прыкладзе іншых бачыў, што гэта такое і ў якія намаганні і грошы выліваецца ліквідацыя наступстваў). А потым выходзіш з хаты — і панеслася! Вуліца ад лістоў нягрэбеная, цяпліца не ўскапаная, сад не пабелены, увесь інвентар ды вёдры-каструлі яшчэ стаяць на лаўцы за хатай, сухія кветкі не пазразанныя... Карацей, не ведаеш, за што хапацца. Не чуючы сябе, пачынаеш грэбці, капаць, зразаць. Час ад часу паглядаеш на гадзіннік і разумееш: я і сёння ўсё не паспею. Па магчымасці давяршаеш распачатае, акідваеш вачыма фронт работ на наступную суботу, пераабуваешся з ботаў у красоўкі, хапаеш у торбу штук дваццаць яблык (увесь балкон імі забіты, але ж шкада — прападаюць), замыкаеш цяжкія замкі, імчыш у суседнюю вёску на маршрутку. Па дарозе кідаеш позірк на могілкі, што наводдаль на пагорку, знаходзіш вачыма знаёмыя помнікі і сілуэты на іх, гаворыш: «Не хвалюйцеся, дома ўсё нармальна». Ужо сеўшы ў маршрутку, ловіш сябе на тым, што магчыма, дзеля таго, каб тым, што ляжаць на пагорку, сказаць гэтыя простыя словы, ты і нясешся галопам з горада кожную суботу...

А ў нядзелю — плед, какава і каты? Дзе там! За тыдзень набярэцца спраў і ў кватэры. А яшчэ папарадкаваць прывезенае — напрыклад, зварыць павідла з яблык ці нафаршыраваць гарбуз: не прападаць жа ўраджаю, трэба ж нешта рабіць. Сёлета да ўсяго іншага я сабе і «дачны нататнік» арганізавала: вярнуўшыся з вёскі, кожны раз запісваю, што дзе пакладзена на зіму, якія сарты былі ўраджайныя, што дзе расло на агародзе. Бо кожны год вясной — хоць забі, не ўспомніш. Некаторыя вельмі патрэбныя рэчы знаходзяцца толькі ў канцы лета, дый то выпадкова...

ВОСЬ заўтра зноў у сем гадзін зазвоніць будзільнік. І зноў бягом. І так да першага снегу, а то і даўжэй... Затое... Хто там што казаў пра восеньскую нуду і дэпрэсію, асабліва ў лістападзе? Не, не чула. Чаго і вам шчыра жадаю.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона: ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703

Продавец: ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, Восточный переулок, 17

Оператор ЭТП: ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф.46. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by

Предмет аукциона: **СООРУЖЕНИЕ НЕУСТАНОВЛЕННОГО НАЗНАЧЕНИЯ,**
общ. пл. 791,9 кв. м, инв. № 00020030,
адрес: г. Орша, пер. Восточный 2-й, 19А.

Сведения о земельном участке:
земельный участок общей площадью 0,7536 га предоставлен продавцу для строительства и обслуживания сооружения неустановленного назначения с инв. № 00020030 на праве аренды до 31.12.2049.

Начальная цена с НДС 20 %: **287 189,32 бел. руб.**
Шаг торгов составляет 5 % от текущей цены предмета аукциона

Регистрация перехода права собственности на предмет аукциона к Покупателю будет осуществляться в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 31 декабря 2018 г. № 506 «О развитии Оршанского района Витебской области». Государственная регистрация договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 30 рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by.**
Ответственность участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: **www.ipmtorgi.by.** Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

